Новы Час | 29 студзеня 2021 | № 4 (712) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №1

Літаратурная Беларусь

Выпуск №1 (173)
(студзень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by



Змест

Тамара Аўсяннікава: «Завітаюць вершы — шлю падзяку небу»

З літаратуразнаўчымі нарысамі, вершамі, апавяданнямі Тамары Аўсяннікавай знаёмыя не толькі чытачы Магілёўшчыны, дзе яна жыве цяпер. Нарадзілася на Гомельшчыне, скончыла філфак БДУ, працавала настаўніцай, бібліятэкаркай, інжынерам, метадыстам, загадчыкам крамы. Атрымала другую вышэйшую адукацыю эканаміста.
Сёння захацелася пагутарыць з ёю на «новачасных» старонках «Літаратурнай Беларусі» — з асобаю чулай да хараства роднага слова і чалавечай душы.

— Спадарыня Тамара, азіраючыся назад, што вас найбольш цешыць?

— Цешыць тое, што моладзь мае больш магчымасцяў, чым было ў майго пакалення. Цяпер межы адкрыты, ёсць высокатэхнічныя сродкі для самаадукацыі і самаўдасканалення. Цешыць, што я яшчэ запатрабаваная, працую, магу падзяліцца сваім досведам з моладдзю, поруч з якой не адчуваю свайго ўзросту.

— А што засмучае?

— А засмучае тое, што час надта імклівы, не толькі ў нас, на ўсёй планеце, і за гэтай імклівасцю мы не заўсёды зауважаем асобнага чалавека, кожны заняты сабою. Засмучае, што мы страчваем сваю нацыянальную адметнасць. Максім Багдановіч у лісце да простых людзей «Хто мы такія?» ставіў пытанне аб ідэнтыфікацыі беларуса. Мінула стагоддзе, а пытанне актуальнае... Дабрыні і павагі стала менш, дрэнных звычак больш.

— Радзіма для вас — гэта ўся Беларусь ці хутчэй Лоеўшчына?

— Радзіма — гэта ўся Беларусь. У вёсцы Сяўкі, што на Лоеўшчыне, я пражыла 17 гадоў. Потым быў Мінск, Мёршчына, Магілёў. Я не прымаю выразу «малая радзіма». Родны дом, мясціны, дзе нарадзіўся, дзе прайшло дзяцінства, назаўсёды ў сэрцы і памяці, гэта так. Але я не дзялю Радзіму на малую і вялікую, як нельга падзяліць на часткі «любоў». Ты альбо любіш, альбо не.

— Якія творы і якіх аўтараў вам хочацца чытаць і перачытваць?

— Я перачытваю добрую паэзію, якая дорыць слёзы радасці. Аўтараў не называю — іх многа. Летам звярнулася да паэзіі Уладзіміра Караткевіча і да яго празаічных твораў: «Ладдзя роспачы», «Старая легенда». А яшчэ так многа непрачытанага!

Маімі настольнымі кнігамі з'яўляюцца слоўнікі, кнігі па вершаскладанні і літаратуразнаўстве, Біблія, паэзія — беларуская, руская, англійская, японская, кітайская...

— Вы пачалі пісаць ужо ў сталыя гады. Хто альбо што падштурхнула да гэтага?

— Кожны прыходзіць да творчасці ў свой час. Схільнасць была. Любоў да паэзіі перадалася ад мамы, якая многа ведала на памяць вершаў, многа чытала. Яна не завучвала са мной вершы, не вучыла мяне любіць паэзію. Звычайна вечарамі, за кудзеляю ці за іншаю манатоннаю працаю, у святочныя дні, чытала вершы. Хутчэй для сябе — такая ў яе была патрэба. А я слухала. Мне і сёння многія вершы гучаць голасам мамы. Адпаведны ўплыў зрабілі ўмовы, у якіх выхоўваюцца вясковыя дзеці.



Я не прымаю выразу «малая радзіма». Родны дом, мясціны, дзе нарадзіўся, дзе прайшло дзяцінства, назаўсёды ў сэрцы і памяці, гэта так. Але я не дзялю Радзіму на малую і вялікую, як нельга падзяліць на часткі «любоў». Ты альбо любіш, альбо не



Фотакалаж www.devprojournal.com

Мае набыткі невялікія. Найбольш важнае — гэта заняткі з моладдзю ў літаратурных клубах «Творчая гасцёўня» і «Святліца», а таксама чатырохтомнае выданне «Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі», над якім мы працуем разам з кандыдатам філалагічных навук Святланай Калядкай. Выйшлі ўжо тры тамы.

— Падчас працы над гэтым выданнем што было для вас самым цяжкім?

— Завочная праца з родзічамі, настаўнікамі, аднакласнікамі. Даводзілася па тэлефоне запісваць іх успаміны, потым апрацоўваць і зноў жа па телефоне узгадняць. З некаторымі блізкімі цяжка наладжваўся кантакт. Былі цяжкасці і ў зносінах з некаторымі пісьменнікамі, але гэты бок працы няхай застаецца са мною.

— Як настаўніца маладых талентаў скажыце, ці адрозніваецца сучасная творчая моладзь ад сваіх папярэднікаў?

— Моладзь заўсёды моладзь. Адрозніваецца тым, што гістарычныя, эканамічныя і культурныя ўмовы розныя. Час і тэхнічны прагрэс накладае адбітак. Яны больш прагматычныя. Але не ўсе. Творчы чалавек ва ўсе часы няўтульна сябе пачувае ў грамадстве і ва ўсе часы адзінокі. Мне ёсць чаму павучыцца і ў іх.

— У параўнанні з пачаткам пісьменніцкага шляху ці змяніліся вашы творчыя перавагі, праца над якімі формамі і жанрамі найбольш даспадобы цяпер?

— Я не аддаю перавагу нейкім жанрам. Раблю тое, што павінна рабіць. Трэба завяршыць пачатае выданне па творчасці Яўгеніі Янішчыц. Трапіла мне ў рукі анталогія беларускай паэзіі на рускай мове «Дыхание времени» ў перакладах Івана Бурсава — і не пакінула абыякавай: напісала артыкул. Запрасілі прыняць удзел у Куляшоўскіх чытаннях — з'явіўся яшчэ адзін артыкул. Завітаюць вершы — шлю падзяку небу. Не сакрэт, што паэзія патрабуе адпаведных абставін і настрою. Калі хутка бегчы, можаш не пачуць яе голасу. Я не той пісьменнік, які жыве толькі пісьменніцкаю працаю і лічыць патрэбным кожны дзень пісаць...

— Якія крыніцы жывяць ваша натхненне?

— Прырода, кнігі, людзі, падзеі. Пушкін некалі казаў, што натхненне — гэта ўменне настроіць сябе на працоўны лад.

— Што на вашу думку шкодзіць, а што ідзе на карысць пісьменніку-пачаткоўцу?

— Дрэннаму танцору і ногі перашкаджаюць. Калі сур'ёзна — тое, што на карысць, тое і перашкаджае. Адсутнасць тэарэтычных ведаў літаратуры пачаткоўцу шкодзіць, але і дапамагае, бо ён піша разняволена, не азіраючыся. Набыўшы адпаведныя веды, вопыт, ён страчвае юнацкія амбіцыі, рамантычны запал. Па вялікім рахунку таленавітаму чалавеку ўсё павінна ісці на карысць, асабліва няўдачы.

— Літаратура будучыні... Якой яна бачыцца вам?

— Што літаратура будзе, я ўпэўнена. А якой яна будзе — будучыня і пакажа.

— Найлепшы адпачынак — гэта...

— Калі ты сам-насам з прыродаю. І — каля мора.

— І на фотаздымках, і ў рэальным жыцці вы заўжды выглядаеце прывабна і шляхетна. Адкрыйце сакрэт вашай маладосці і прыгажосці, калі, вядома, гэта не таямніца?

— На такія кампліменты я звычайна адказваю: «Павінна ж і ў мяне быць штосьці добрае». З гадамі мы ўсё больш становімся падобнымі на сваіх бацькоў... *(Задумалася).* Сакрэта ніякага няма, проста калі выходзіш у людзі, трэба пераапрануцца, крышку прыўкрасіць сябе, але галоўнае — узяць з сабою добры настрой.

Наша энергетыка ўплывае не толькі на блізкіх, знаёмых, але і на сонечную актыўнасць. Вучоны А. Л. Чыжэўскі яшчэ ў 1924 годзе ў сваёй працы «Фізічныя фактары і гістарычныя працэсы» сцвярджаў, што лёсы чалавецтва знаходзяцца ў залежнасці ад лёсаў сусвету і што гэта не толькі паэтычная думка, якая натхняе мастакоў на творчасць, але ісціна, прызнаць якую патрабуюць вынікі дакладнай навукі...

Гутарыла Таццяна Барысік

Словы пра Васіля Быкава

Адам ГЛОБУС

Велічны дуб

На сустрэчы з чытачамі, якая праходзіла ў мінскім Доме літаратараў, Васіль Быкаў атрымаў стандартнае пытанне: «Хто з сучасных пісьменнікаў вам блізкі?».

Зазвычай у адказе пісьменнік пералічвае сяброў і раўналеткаў, з якімі разам прыходзіў у літаратуру і поруч ідзе па жыцці. Быкаў зрабіў інакш, сказаўшы, што на ягоны розум сапраўдны пісьменнік падобны не на дрэва ў густым лесе, а на велічны дуб, які самотна стаіць пасярод голага поля.

Калегі палічылі параўнанне Васіля Быкава абразлівым. Доўгі час у пісьменніцкіх колах абмяркоўвалася ягоная ганарыстасць і пыхлівасць. Каб Васіль Уладзіміравіч са сцэны казаў нешта іншае пра блізкіх і далёкіх для яго пісьменнікаў, я не чуў. Таму чытаючы шматлікія аповеды самых розных людзей пра іх нібыта вялікае сяброўства з Быкавам, я не надта бяру іх на веру.

«Лета»

У мінскай рэстарацыі «Лета» маладыя беларускія пісьменнікі адзначалі выхад першай кнігі Быкава «Жураўліны крык». Большасць тостаў і большасць добрых слоў сказалі не аўтару, а ягонаму рэдактару — Уладзіміру Дамашэвічу, бо менавіта ён абараняў кнігу ад нападаў недобразычлівых рэцэнзентаў. Дамашэвіч угаварыў баязлівае выдавецкае начальства выпусціць твор маладога правінцыяла. Тая гулянка ў рэстарацыі была запамінальнай, пра яе потым шмат хто распавядаў.

Пісьменнікі казалі, што Дамашэвіч ніколі не нагадваў Быкаву пра свае заслугі і ніколі нічога не папрасіў у Васіля, калі той зрабіўся ўплывовым чалавекам. Казалі пра тое яшчэ і таму, што сам Васіль Быкаў не згадваў баявітага Дамашэвіча, які дапамог яму выйграць змаганне за першую кнігу.

Зразумела, я ведаю гэтую гісторыю з расповедаў свайго бацькі, а таксама Міхася Стральцова і Рыгора Барадуліна. Але іх расповеды былі такімі вобразнымі, што мне цудоўна ўяўляецца, як маладыя беларускія пісьменнікі балявалі ў рэстарацыі і хвалілі Уладзіміра Дамашэвіча, які з маладосці насіў мянушку Дзед.

Чарнавікі

Пасля заканчэння твора Быкаў знішчаў чарнавікі. Увесь назапашаны матэрыял, усе варыянты, усё, што не ўвайшло ў апошні чысты экзэмпляр рукапісу, Быкаў выкідаў на сметнік. Пасля выхаду твора ў свет ён ніколі не перачытваў уласныя апавяданні, аповесці і раманы. Лічыў, што гэткае перачытванне будзе замінаць працы над новай рэччу. Кожная аповесць і кожны раман Васіля Быкава былі цалкам завершанымі і цалкам асобнымі кнігамі — прынамсі, ён бачыў іх менавіта такімі.

Падобны падыход да літаратурнай працы быў актуальны ў эпоху вялікага кіно, калі паводле паспяховай кнігі адразу рабіўся кінасцэнарый і фільм. У часы серыялаў ён выглядае крыху архаічна, бо не прадуктыўны.

«Пахаджане»

Прыпавесці Васіля Быкава сабраліся ў кнігу «Пахаджане», вокладку для якой рабіў я. З выхадам кнігі выйшла затрымка, бо я не мог знайсці вядомых пісьменнікаў, якія пагадзіліся б напісаць пару сказаў для вокладкі пра новую прозу Васіля Быкава. Мэтры казалі, што раней Быкаў быў вялікім пісьменнікам, а ягоныя прыпавесці — параза, правал, дэградацыя.



Фота Алены Адамчык

Я меў цалкам супрацьлеглае меркаванне. Для мяне «Пахаджане» — найлепшая кніга Васіля Уладзіміравіча, бо яна напісана для беларусаў, для Беларусі, для нас. У ёй няма плакатнай савецкасці, няма кіношнага схематызму і няма імперскай мілітарыстычнасці.

Вокладку я зрабіў, кніга выйшла і дайшла да чытача. Цікавая метамарфоза адбылася пасля смерці Быкава. Пісьменнікі, якія адмовіліся тады пісаць добрыя словы пра Васіля Уладзіміравіча, гучней за ўсіх пачалі казаць пра сваё сяброўства з вялікім чалавекам.

Хадакі

Песіміст Васіль Быкаў, гледзячы і апісваючы сучасных беларусаў, назваў іх пахаджанамі. Каб Васіль Уладзіміравіч дажыў да нашых дзён і паглядзеў шэсць сезонаў серыяльнай эпапеі «Гульні тронаў», дык мог бы і пераназваць сваіх пахаджан у хадакоў. Дарэчы, у кіно яны не проста хадакі, а белыя хадакі, амаль што беларускія хадакі.

Быкаў не дажыў і не пабачыў белых хадакоў, а мы дажылі, той-сёй з нас іх пабачыў і паспеў палюбіць. Цяпер на сакрамэнтальнае пытанне беларускага прарока Янкі Купалы «А хто там ідзе?» можна дадаць у адказ: «Хадакі! Белыя хадакі! Беларускія хадакі! Беларусы…».

Лысіна

Людзі лысеюць, мужчыны — больш, жанчыны — менш. У жанчын шмат спосабаў прыхаваць парадзелыя валасы. Яны і хусткі з капялюшыкамі ў памяшканнях навучыліся не здымаць, яны і парыкі розных фасонаў носяць, яны нават чалму зрабілі моднай па ўсім свеце. У мужчын змаганне з лысінай мае меней сродкаў.

Бываюць перыяды, калі голеная галава робіцца моднай. Тады можна не хвалявацца, што ўсе заўважаць, як ты аблысеў у маладым веку. Бываюць іншыя часы, калі мужчыны носяць доўгія валасы. Тады — бяда.

Можна схаваць лысіну пад кепкай. Так рабіў празаік Іван Пташнікаў. Прачытаўшы ў мяне сказ пра чалавека з кепкай на лысай галаве, ён спытаў: «Адкуль ты ведаеш, што ў чалавека пад кепкай лысіна?» — «Бачу! Яно ж адразу відаць…», — кажу. «Як ты можаш бачыць? Кепка непразрыстая…» — «Кепка інакш сядзіць. А яшчэ мяне вучылі маляваць усе рэчы так, нібыта яны і сапраўды празрыстыя. Каб так маляваць, трэба ўважліва глядзець на кожную рэч…» — «Неперakанаўча! Не можаш ты бачыць лысіну пад непразрыстай кепкай!».

Пташнікаў не стаў удакладняць, што ягоную лысіну пад шапкаю прыкрывае яшчэ спецыяльна адрошчаны касмыль валасоў. Тую прычоску, калі лысіна закрываецца касмылём, у народзе называюць заграбонам.

Шмат хто з беларускіх пісьменнікаў хадзіў з такім заграбонам. Найбольш недарэчным ён глядзеўся на галаве Васіля Быкава. Недарэчным, бо Васіль Быкаў вучыўся на скульптара, наведваў мастацкую вучэльню. А мастакі не саромеліся сваіх лысін, ганарыліся высокім ілбом, малявалі ўласныя лысыя галовы з любоўю, з увагай і з павагай.

Каб я быў крыху старэйшы, дык абавязкова параіў бы Васілю Уладзіміравічу ўзяць нажніцы і абстрыгчы заграбонны касмыль, як абстрыг яго Пабла Пікаса. Зрэшты, Якуб Колас свой касмыль не абстрыг.

Чаравікі

Дайшло да таго, што ў Васіля Быкава не было грошай на новыя чаравікі. Высветлілася гэта выпадкова, калі пісьменніка запрасілі выступіць у Беларускім ліцэі. Ён прыйшоў на выступ у стаптаных і парваных чаравіках.

Выкладчыца Ганна Кісліцына, пабачыўшы парваны абутак на сусветна вядомым пісьменніку, пачала кампанію па дапамозе Васілю Быкаву. Яна патэлефанавала ў Маскву перакладчыцы Тамары Залатухінай, тая праз свае сувязі зрабіла Быкаву запрашэнне за мяжу. У выніку той кампаніі фінскі ПЭН-клуб прывеціў беларускага пісьменніка і прызначыў яму стыпендыю.

Пасля Фінляндыі Васіль Быкаў жыў у Чэхіі і Нямеччыне. У Беларусь ён вярнуўся смяротна хворым, каб пабыць на Радзіме ў самыя апошнія дні.

Скураны пінжак

Адразу пасля пахавання Васіля Быкава ўзнялася хваля ўхваленняў. Як яго толькі не ўзносілі, з кім толькі не параўноўвалі, чаго толькі не напланавалі для ўшанавання ягонай памяці… Не пераказаць, не пераглядзець і не перачытаць. Запомнілася, што адзін крытык параўнаў Васіля Быкава з Уільямам Шэкспірам. Пэўна, той крытык не ведаў, што Быкаў не любіў тэатр. Ён быў далёкі ад тэатральнага асяродку.

Васіль Быкаў належаў да пакалення вялікіх аматараў кіно. Таму і проза ў яго наскрозь кінематаграфічная, яна лёгка перакладаецца на мову кінасцэнарыяў. Экранізацыі аповесцяў «Сотнікаў» і «Альпійская балада», — можна сказаць, узоры савецкага кіно пра Другую сусветную вайну.

Васіль Быкаў і апранаўся як савецкі кінарэжысёр. Насіў чорны скураны пінжак. Такі пінжак лічыўся модным і прэстыжным рэччу напрыканцы 70-ых. Калі Быкаў з'яўляўся на сцэне ў бліскуча-чорным пінжаку, у абліччы пісьменніка было нешта вайсковае і нават камісарскае.

Зоркі

Бачу свайго былога аднакурсніка скульптара Батвінёнка ў дарагім касцюме і пытаюся: «Нашто ты надзеў касцюм? Вяселле ў каго ці яшчэ якая ўрачыстасць?» — «Проста прывыкаю да новага касцюма. Раней, як ты правільна заўважыў, я касцюмы не насіў. Цяпер падумаў… Запросяць мяне ў які высокі кабінет, а ў мяне няма ў чым туды ісці. Пайшоў і купіў даражэзны, скажу табе, касцюмчык. Цяпер во разношваю і выгульваю. І як толькі атрымаю запрашэнне, дык адразу — раз, і ў касцюм!» — «Ты ж мастак, можаш і ў швэдрыку на прыём пайсці…» — «Несалідна ў швэдрыку…».

Пагаварылі мы і пайшлі ў розныя бакі. Я пра дарагі касцюм Сашы Батвінёнка і забыўся быў, ажно пакуль не пабачыў ягоны праект помніка Васілю Быкаву. На праекце бронзавы Быкаў схіліўся над вялізнай чырвонай каменнай зоркай.

Быкаў усё сваё жыццё хадзіў з рознымі зоркамі і пад рознымі зоркамі. Хадзіў з зоркай на пілотцы, хадзіў з зоркамі на пагонах, хадзіў з залатой зоркай на грудзях. Адпаведна, і на помніку ён атрымаў чарговую зорку.

Выглядала на тое, што Батвінёнак свой праект зацвердзіць, бо ў яго быў дарагі касцюм, каб схадзіць на прыём і вырашыць усе дробныя і вялікія праблемы.

Пакуль не склалася, але будзем спадзявацца, што праекту Батвінёнка зоркі паспрыяюць. Калі зоркі не паспрыяюць праекту Батвінёнка, дык няхай яны спрыяюць яшчэ лепшаму помніку, які заслужыў Васіль Уладзіміравіч.

Лозунгі

У пакаленні пісьменнікаў-мілітарыстаў, якое ў нас ачольваў Васіль Быкаў, несупынна гучаў лозунг: «Усё для фронта, усё для перамогі!»; у сучаснага пакалення літаратараў-эстраднікаў матывацыі зусім іншыя: «Усё дзеля сцэны, усё дзеля авацый!».

«ІДЗЕ НАРОД…»

Гэтая песня ў 1974 годзе стала візітоўкай адчайнага змагання чылійцаў супраць вайсковай хунты на чале з генералам Аўгуста Піначчэтам. Мелодыю і словы прыдумалі ўдзельнікі папулярнага гурта «Кілапаюн», аранжыроўку дапрацаваў вядомы музыкант Серхіа Артэга Альварада. Першы пераклад тэксту песні на беларускую мову зрабіў Макс Шчур, а я вырашыў прапанаваць сваю версію.

Лявон Баршчэўскі

З'яднаных нас многа, за намі перамога!

Наш годны спеў — пра перамогі час,
Адзінства сцяг зноў акрывае нас.
І побач тут трывала станеш ты,
Пачуеш спеў — як толькі золак наш азорыць дзень,
Ягоны
Бліснe нам прамень.
Жыццё святлом заззяе нам тады.

Каб нам не жыць, як мы жылі раней,
Трыумфу марш, у ім ідзём мы ўсе
За тое, каб нам шчасны лёс прысцеў,
Тут прагучыць мільён непераможных галасоў
Ізноў.
Наш вольны, годны спеў,
Свабоду ён радзіме прынясе!

Цяпер у тым памкненні народ яднае вера,
Ён голасам магутным нас клікае: «Наперад!».
З'яднаных нас многа, за намі перамога!
З'яднаных нас многа, за намі перамога!

Наш родны край адзіным паўстае,
Адным шыхтом ідзе сюды здалёк,
З усіх куткоў айчыны аднае,
З лясоў, з далін, з'яднаны ў непахіснай барацьбе,
Каб край здабыць сабе
І так
Зрабіць у будучыню моцны крок!

Спявайма ўсе пра пераможны час,
Ідзе народ за праўду кожны раз,
Магутны люд, агністы батальён,
Узняў на сцяг усё, за што здаўна змагаўся ён.
Жанчыны тут,
Агонь іх сэрц не згас,
Рабочы люд, хто стане побач з вас?

Цяпер у тым памкненні народ яднае вера,
Ён голасам магутным нас клікае: «Наперад!».
З'яднаных нас многа, за намі перамога!
З'яднаных нас многа, за намі перамога!

Не вырваць свабоду ў адзінага народу!
Не вырваць свабоду ў адзінага народу!

Пераклад з іспанскай Лявона Баршчэўскага


Фота www.depositphotos.com

Трэці Эдэм



Валянціна АКСАК

Белая кроў

*Безліч бязважкіх аблокаў,
бязмежжа пунсовага мора,
бязмоўная блізкасць жаданага цела,
бязлітасны боль
вывяржэння бязгрэшнага немаўля,
боязь бачыць жалобнае ўзлоб'е
на бацькоўскім узложжы,
бажавольная вольнасць вандровак
да бязлюдных азёраў
без мілаты й жагнаты.
Божая тайніца без ангажэментаў.
Белая Баля.
Была.
Упунсоўлена ў ейную млосць
белае —
жэрала збыткаванае,
барва зжарсцвелая,
забыты,
знячэўлены жах,
жуда,
безупынная зумкасць пустэчы,
цвяльба бесстасоўная,
бадзянне за поўняй
з журбой безаглядней.
Бурбалкі ў лужыне
бурапеннага жніўня.
Белая кроў.*

РБ

*Замоўклі музы,
толькі свішчуць кулі,
рулятрымальнікі страляюць трапна,
прыцэл наводзячы на тых,
каму заўжды
спявалі музы.*

Новы сад

*Раз пайшла такая куляпляска —
я закладаю новы сад.
Няўдобіцу штодня ўрабляю,
каб насадзіць кустоў і дрэваў,
няўразлівых да маразоў.
Загартаваныя зімовай лютасцю,
вясной яны ашчэрацць
кветкавыя стрэлкі
і ўсіх стралкой
праткнуць навылет.*

Кармазынавы бэз

*Жыву пры гасцінцы,
які ўтрамбавалі ўсялякія паязджане.
Іх колаў рыпенне
даносіцца ў мой
адасоблены сад,
і гамонкі звяглівыя чуюцца
нат пад згусцелымі шатамі вінаграду.
Не схавацца ў альтанцы далёкай
за шчытнаю квеценню капрыфоляў.
Бездапаможна аралія
раскрыліла лісце.
Ратунку няма —
так я ў роспачы думаю.
Але раптоўная ўзгадка
навукі бабулінай пра колерасхоў
прымушае закладваць прысады
наўсцяж шляху,
якіх анічога не зрушыць.
Язмін для пачатку й шукаць
анідзе не спатрэбілася.
Белапенныя кветкі яго
раскашуюць пры кожнай
тутэйшай гасподзе.
Заканцоўваць прысады
надумала млечным жылістэкам.
Дзякуй сябру з Уроцлава —
Ма́ю акцэнт на заход ад маёе сядзібы.
Але зззяе прагал пасярэдзіне,
і нічым не магу
вартым цэнтру пазначыць.
Праз цэлую восень пакута.
Бо ж трэба,
каб кветкі ў прысадах успыхнулі ўраз
і ўсцерабілі
чужынцамі ўтоптаны шлях.
І іх аглушылі,
каб не гойсалі тут, як удома.
Панадным самюткім у цэнтр
то будзе, бадай што,
заўсёднік шляхецкіх маёнткаў
водарны бэз.
Але ж — бэзавы.
Не шчэпка ў ахову.
Ды во ўчора нашчадак Сікоры
тэлефануе і кажа,
што ўжо ма́е
густа агністы
ахоўнічы бэз.
Кармазынавы.*

Суседзі

*Прыйшла на гасціны суседка.
З грушавым струдэлем
і каваю з цынамонам.
Паказала новыя творы,
якіх зачакаліся
парыжскія знаўцы
яе ювелірнага таленту.
І між іншым сказала,
што да яе,
як снег неспадзеўны ў кастрычніку,
звалілася на адпачынак
мама з Парыжу.
І яна даручыла
спытацца,
ці маю я нейкія
французскія карані.
Але з чаго тое раптам?
Вашыя кошыкі заваконныя
ёй нагадваюць аўру
парыжскіх прадмесцяў,
і яна тут пачулася,
быццам бы дома.
Кошыкі з ка́ламі, канамі і пеляргоніямі —
о то ж кайф мой штодзённы!
А тут апынулася —
шчэ і французскі.
Але вось сёння ў двары
ў няўдобіцу перадваконную
я хрызантэмы садзіла.
Белыя і кармінныя.
І калі завяршала малюнак,
сусед аб'явіўся і паабяцаў,
што праедзе па кветніку
на машыне навюткай сваёй.
Чырвона-зялёнай.*

Трэці Эдэм

*Ліліт, сваёй найпершай любай
Адам аддаў усё, што меў:
пяшчотны цёплы жвір
прыморскага ўзбярэжжа,
стракатых галасістых птушак,
квяцістыя плады духмяных шатаў
неўтаймоўнага кустоўя
і таўшчэзных дрэваў.
Ліліт з падзякаю дарунак прыняла
і дбайнай гаспадыняю
надумала ў ім быць.
Абладу дзікае красы яна
прыручваць стала.
У кожнае вяртанне з палявання
Адам здзіўляўся пераменам.
Прыліў не злізваў болей вогнішча,
звяры рахмана следам за Ліліт ішлі
і нават усяляк імкнуліся ёй паслужыць,
а птушкі спевы зачыналі толькі
паводле ўзмаху лёгкіх ейных рук
ці грацыёзнага нахілу гордае галоўкі.
Адам на сёмым небе быў ад шчасця.
Але яго бянтэжыць пачало
за нейкім часам,
што гармонія ў хаосе
вымагала правілаў быцця.
Хачу вось тую дулю на вярбе,
але пакуль не спелая — не можна.
Віна мне налівай,
ну й што, што не ўбрадзіла.
Граната з дрэва гэтага сарві —
які шчэ тут мне Абба
можа ўказваць забарону.
Сумна стала, адным словам,
Адаму з любаю Ліліт.
А тут і неспадзеўкі — Ева.
Без гармоніі і без забаронаў.
Фінал вядомы вам.
Ад Адама мацуюцца сыны ў Ліліт.
У Евы дочкі падрастаюць.
Ну ад каго яны — то ведае той змей,
якому сам Адам паддаўся.
Астатняе — нам неістотна.
А важна,
што Эдэмы два намарна існавалі.
Для нас.
Вось тут.
І я запачаткоўваю ўжо трэці.
А на спамогу мне
аўкніцеся,
сыны сыноў
каханае Ліліт.*

Мільтонія

*Хаваю ад вачэй цікаўных
маю маленькую сяброўку.
Яна — то ўтоеная мілата,
цнатлівая краса
паміж напышлівых суседак,
якія з фанабэрыяй абранасці
раскошна чуюцца
ў альковах уладарных.
А ёй ніяк няўцям
іх крэда дабрадзеек:
мы раскрываемся для ўсіх,
і ў нас усе ўваходзяць.
Яшчэ і дакараюць незгавору:
маўляў, і ты ж, як мы,
таксама з архідэяў,
німфаманістасць якіх
вучонымі мазгамі
даўно ўжо патлумачана
глыбокім лонам
нашых кветак.
Натура наша, моў, такая —
з сіндромам гіперэратызму.
Дый нарадзіліся мы ўсе з табой
у час з'яўлення
самай першае прафесіі.
Усмешка светлая ў адказ
і шлях са мной
у келлю патаемную.
Тут, у піліпаўскай цішы,
мы прычакаем
абраннікаў шляхетных,
якім патрэбна
наша мілата
й вялікакняжскі тон.*

Бура

*Ты хвошчаш па мне
хваробнай хлуснёю —
моўчкі гляджу табе ў вочы.
Дубасіш мяне
кара́вай даўбешкай —
вышэй уздымаю я галаў.
Атрутную кулю
ў мяне дасылаеш —
я не па́даю.
Ты нацкоўваеш зграю шакалаў,
каб яны разарвалі мяне —
нябачнаю я станаўлюся,
а яны загрызаюць адзін аднаго.
І тады я ўбіраюся
ў шлюбныя строі
і на высокіх абцасах
выпраўляюся ў свет,
дзе неба мяне люструе.
І там
я пяю
свае лепшыя песні,
ад якіх усцынаецца бура,
і зносіць цябе
ў Аід.*

Няўразлівыя

*Бясколерныя шэрагі плябеяў,
ураджаныя моцным ветрам навальніцы,
уздыбарылі поўсць,
ашчэрылі крывыя ўсмешкі
і лязгатам зубоў
спрабуюць заглушыць
раскаты грома.
Варты жалю выгляд
пераляканых гневам неба.
Яны былі ж упэўненыя
ў сваёй адвечнай важнасці
тут і цяпер
пад покрывам зямнога божышча,
пагардліва глядзелі
на ўсіх тых,
каму пачуцці самасці
ад роду невядомыя.
Нас — арыстакратаў.
Бо мы — то зоры самавольныя,
якія кантралююць шлях свой
праз галактыку ў сусвет
без тых няшчасных,
што засталіся ў лёку
ўдрузлае дрыгвы.*

За брамаю апостала Пятра

*Мой новы сад
сыходзіць у зіму.
Адно шчэ кроплі
пурпуровых хрызантэмаў
балюча раняць крылы
сняжынкам з вышыні,
і тыя на зямлю кладуцца
з бязлётнай лёгкасцю
на палатне збялелым.
Гаючай моцай
караням зіма
і одумам
для ўмроеных пупышкаў —
ці так цвісці, як сёлета,
ці новай барвай набрыняць
і ці даўжэйшыя шыпы ўзгадоўваць
непакорным ружам.
Спі, сад!
Але не летаргічным сном.
Сустрэнемся ў сакавіку!
І ты падорыш мне
вясняных красак,
якія асвятляць усю РБ,
а чарната ўратуецца
адно за брамаю
апостала Пятра.*

Навальнічная лямпа



Вячаслаў КАЗАКЕВІЧ

Здаралася ўвечары зашумець дажджу — пачыналіся прыгоды. Страказа, бы праблудны карабель, падплывала да вакна на шкляных вёслах.

— Бялізна! — Страшным голасам выгуквала маці.

І ўсе, на злом галавы, кідаліся на падворак.

Міця ведаў, калі на вяроўкі накідваецца вымытая бялізна, адразу падкрадаецца дождж. Маці лаяла дождж за неўразумелую ахвоту да яе выкручаных рэчаў. Але, магчыма, ён прасіўся да яе ў памочнікі, каб яшчэ раз спаласнуць бялізну.

Парасон у хаце быў толькі адзін. І той паламаны і крываваты, як трухлявая хатка. Калі яго з намаганнем адкрывалі, з яго вылазілі сталёвыя пруткі, нібыта парасон збіраўся не пад дождж, а ў гурток вязання.

Губляючы прышчэпкі, маці бязлітасна адбірала ў вяровак прасціны і накідвала іх на бацьку, нібы бурнос. Бацька марна адбіваўся:

— Пачакай, я нічога не бачу!

— Міцька, — не зважаючы на яго, загадвала маці. — Бяжы ў сад, падапры кійком дзверцу склепа!

Міця бег у сад, які размаўляў з дажджом, і, чым вышэй выцягвалася вакол яго трава, тым болей быў шчаслівы.

Цёмна-фіялетавая хмара нібыта языком злізвала з неба рэшткі сонца і парушынкі галак. За языкастай хмарай праглядалася іншая, злавесна-шызая, шматслаёвая, падобная на агромністую старую порхаўку.

— Ой, навальніца будзе! — прарочыла маці.

— Без панікі! — заклікаў бацька.

Па-курынаму атрасаючыся, наўючаныя бялізнай, нібы вярблюды, яны заскоквалі ў калідор. Дзвярны кручок дзюбаў жалезнае колца.

У пацямнелым пакоі загараўся абажур. Маці рэзка тузанула дрот радыё з разеткі. Радыё, быццам яму вырвалі язык, нямела. З трэскам зачыняліся форткі. Маці была цвёрда перакананна, што адчыненыя форткі і ўключанае радыё прыцягваюць да сябе маланкі.

Дождж шумеў усё гучней. Удалечыні ўжо патрэсквала і пагрымлівала, нібыта там сутыкаліся гіганцкія більярдныя шары.

— Усе кветкі палягуць, — бедавала маці.

— Усю бульбу паб'е, — адказваў бацька.

Страказа ўжо не настаўляла ў вакно пукатыя насавыя тэлескопы. Верагодна, яна забілася пад дах і перадавала на сваю планету тэрміновае паведамленне, што трапіла пад незвычайнае мора, што перарываецца і стаіць адносна зямной паверхні амаль вертыкальна. На чужой мове гэта гучала так: «Гыр, мыр, карамыр, сыр-сыр!»

Знянацку ўспыхвала такая велізарная маланка, што ўсе слеплі.

— Не маланка, а белая гарачка! — паблажліва заўважаў бацька, які любіў усё вялікае і моцнае.

— Зараз як ударыць... — прыціскала маці руку да сэрца.

І насамрэч чуўся такі выбух, што, здавалася, хата абрынецца.

Новая маланка лезла ў вочы, нібы іскрыстае павуцінне. Шыбы ў вокнах хісталіся ад грому. Маланкі выглядалі расколінамі ў небе, праз якія можна было ўбачыць іншы свет. Варта было толькі прыкласці вока да іскрыстай расколіны.



Фота www.prib.life

Тут абажур патухаў. На імгненне ўсе камянелі ад нечаканасці.

— Паглядзі пробкі, — прамаўляла цемра матчыным голасам.

Пробкі былі на месцы.

— Тэлефануй на падстанцыю, — працягвала маці.

Бацька шамацеў тэлефонным даведнікам. Запалка апякала яму пальцы, і ён з праклёнамі ўпускаў яе на падлогу.

— Ты мне хату спаліш! — адбірала ў яго маці пачак.

— Падстанцыя? — крычаў у тэлефонную трубку бацька. — Як не падстанцыя? А хто гэта? Ветэрынарная станцыя? Пры чым тут ветэрынарная станцыя?

Ён ізноў круціў тэлефонны дыск і, дазваніўшыся, засмучана даведваўся, што на лініі аварыя.

— Ну ўсё! — шпурляў ён трубку. — Праграму «Час» сёння не паглядзіш!

— І фігурнае катанне, — дадавала маці.

Свечак у хаце не было. Магчыма, бацька лічыў, што яны пасуюць толькі абразáм і бабулькам. А паколькі і тыя, і тыя ў гаспадарцы адсутнічалі, дык і свечак не куплялі.

Затое мелася старая газавая лямпа, што захоўвалася разам са слоікамі з сочывам. Зразумела было, што яна рабіла сярод іх: лямпа пахла саладзей за сочыва.

— Ідзі ў камору, — адпраўляла маці бацьку.

Бацька прыносіў лямпу, здымаў з яе шкляную колбу і запальваў кнот. Мятлушка-лімонніца ўзнікала ў яго далонях. Маці асцярожна працірала колбу белай анучкай. Пераймаючы ад анучкі чысціню, шкло паскрыпвала інача, чым канапа ці чаравікі. Колба размаўляла такім тоненькім камарыным галаском, што хацелася павесці яе ў госці да цвыркуноў.

Бацька ўстаўляў бліскучае шкло ў зубчастае металічнае венца, якое атачала кнот, колцам павялічваў агонь, і прывідна-жоўтае святло залівала пакой. Такое святло, калі прыглядзецца, выпраменьваюць спелыя антонаўкі.

Жоўтая пустэльня акружала стол. Вешалка на сцяне і табурэтка пад ёй адступалі ад лямпы. Рэчы, як бандыты, любяць цемру.

— Не паднось руку да лямпы зверху, — папярэджваў сына бацька.

Міця і сам ведаў: набліжаць далонь да верхняй адтуліны шкла недарэчней, чым закрываць рукой вывяржэнне вулкана. Але ўсё-роўна хацелася гэта зрабіць.

— Пачытаем услых, — бадзёра казаў бацька і прыносіў з залы гарчычнага колеру кнігу.

Лямпа выклікала дух Гогаля. Гэтым Гогалем бацька асабліва ганарыўся. Кожны раз, дастаючы яго, ён не мог стрымацца, каб не прыгадаць, як яму пашэнціла.

— Зайшоў на кірмашы ў кнігарню. А там усе шэсць тамоў стаяць на прылаўку, шпагатам звязаныя... Падрыхтавалі для некага па блату. Я палец у пяцельку і да касы: «Прадаецца? Колькі?». І выйшаў як па паветры!

Міця быў перакананы: кірмашнага Гогаля, патрапанага, пакарабачанага, напаўз'едзенага чытачамі і мышамі, з палінялым шрыфтам і старонкамі з кепскай паперы, запоўненымі плямамі тлушчавага, чайнага і нявызначанага паходжання, відавочна звязалі для здачы ў макулатуру і надта ўзрадаваліся, калі на яго знайшоўся пакупнік.

І ўсё ж ён з задавальненнем слухаў знаёмы расповед, выразна ўяўляючы перад сабой падрапаны драўляны прылавак і стосік кніг, перахопленых шпагатам, да якіх з роблена-абыякавым выглядам кіруецца бацька. Вось ён утыкае палец у пустэчу, атачаную вяровачнай пятлёй, і з годнасцю падыходзіць да прадавачкі.

Свайго ўлюбёнага «Тараса Бульбу» бацька чытаў услых толькі тады, калі патухала святло. Электрычнасць прападала рэгулярна, але не надта часта. Таму бацька пастаянна забываўся, на якім месцы спыніўся. Выпадковыя паперкі і запалкі, што засоўваліся ў кнігу замест закладак, бясследна знікалі. Мажліва, іх раскрадалі гаспадарлівыя казакі.

Але нумар старонкі быў не такі ўжо важны. Міця даўно ўжо прачытаў «Тараса Бульбу» і нават паплакаў напрыканцы, калі Тараса схапілі ў палон і ланцугамі прыкавалі да вогненнага дрэва. Навошта ён нахіліўся па сваю люльку? Усё ж такі паленне — шкодная звычка!

Бацька чытаў у асобах. Ён нюхаў лямпу, як лазутчык-татарын, раскідваў рукі, як п'яны запарожац, намагаўся станчыць гапака, іржаў па-конску, біўся на кулаках, пакуль яго не супакойвала маці. Народны артыст прападаў у ім! Ён бы чыгунную гармату паспяхова паказаў, калі б замест яго гэтую ролю не ўзяў на сябе гром.

— Усё залье, — уздрыгвала маці. — Рабінавая ноч будзе!

«Казакі яшчэ толькі запальваюць і раскурваюць свае люлькі!» — з пачуццём чытаў бацька.

Незразумела было, чаму ноч з навальніцай называлася арабінавай. Але гучала гэта пагрозліва. Мроілася чорная цемрадзь з вогненнымі плямамі. А вось залева з усімі сваімі вынікамі Міцю не палохала. У глыбіні душы ён нават хацеў, каб дождж ліўся ўсю ноч, увесь дзень, увесь тыдзень...

Звычайны дождж — без рук, без ног, без галавы, з адным толькі шоргатам за душой, што мірна шпокаў у забытым у агародчыку эмаліраваным тазіку і адараў паветранымі шарыкамі любую лужыну, каб яна ўзляцела, мог лёгка ператварыць Зямлю ў суцэльны акіян.

Міця разумеў, што пад вадой знікнуць палеткі з трактарамі і пшаніцай, заводы і фабрыкі. Але вось дзіўна: яго зусім не займала, што стане з трактарамі і заводамі. Нават пра іх прысядзібны ўчастак з бульбай і кветкамі, якія немінуча ператворацца ў тапельцаў, ён не думаў.

Пад шоргат дажджу ўтульна было ўяўляць, што іх драўляная хата не патоне, а паплыве па хвалях, як быццам так і трэба. З цаглянага коміна будзе выходзіць дым, як у парахода. Разам з сям'ёй адправяцца ў плаванне галубы на гарышчы, слоікі з сочывам, зламаны парасон і пажоўклы Гогаль з фрызурай, як у Махно. Можна будзе проста з ганка лавіць рыбу!

Бацька тым часам асаджаў горад Дубна. Жыхары ўжо елі зямлю. Міця аднойчы пакаштаваў зямлю. Есці яе было немагчыма.

Парывісты Андрый з мяшкамі хлеба прабіраўся падземным ходам у горад, уваходзіў у высокі дом, ахоплены сном, як зачараваны замак, паўставаў перад панначкай, якой павінны былі прыслугоўваць анёлы, і вымаўляў страшныя словы: «Што мне бацька, таварышы і айчына? Няма ў мяне нікога!».

Міця ведаў, што Андрый загіне, ужо загінуў! І насуперак волі шкадаваў яго, без памяці закаханага, прыбранага перад смерцю ў залатую браню. «Знайшоў каго шкадаваць! — палымнела шкло лямпы. — Здрадніка!». Але спачуванне да нядаўняга школяра, што лазіў у кіеўскія сады па яблыкі, не пакідала Міцю.

Яму здавалася, што і самому Гогалю таемна больш падабаўся перабежчык Андрый, чым яго занудны брат і астатнія казакі. Толькі прызнацца ў гэтым ён не мог. Скажы пра сваю шкадобу Міця, нічога б не было. Можа, маці папярэдзіла б, што ў школе такое гаварыць нельга. А бацька б толькі паморшчыўся і сказаў «Вушы вянуць!». Але калі б Гогаль прызнаўся, што ён за Андрыя, не прадавалі б яго звязанага на кірмашы.

— Чытакі, — папярэджвала маці. — Заўтра не прачнецеся!

Бацька сцягваў з цыгарэтнага пачка цэлафанавую абгортку і клаў яе ў кнігу. Падарожны казак з асяледцам падбіраў лёгкую здабычу, пагардліва яе разглядаў і, неахайна скамячыўшы, надзімаў і шпокаў цэлафанавым пухіром аб далонь.

Гром грымеў за ваконнай фіранкай.

Прайшло шмат гадоў. Як яно і павінна было здарыцца, Міця здрадзіў сваёй радзіме. Але ж ад яго радзімы нічога не засталося. Захавалася толькі іх старая драўляная хата. Нават дым над цагляным комінам не разбурыўся.

Ранкам Міця выходзіць на ганак і збіраецца памыцца. Але спачатку бярэ старую раскудлачаную швабру і адпіхвае ёю велізарную надакучлівую белую акулу.

Пераклад з рускай мовы Веры Лойка

Мацярынская плата



Людміла ШЧЭРБА

***

Ён вызнаваў віскі
і жанчын
розных форм
уласнасці
ён не хацеў падрабязнасцяў
у адказ
на сустрэчныя іскі
Джон Ячменнае Зерне
ў целе
бы ў бочцы пад вобадам
жыць рок-н-рольным клопатам
да зорак ісці
праз церні
Ён спавядаўся жанчынам
розных форм
закаханасці
талент губляў з апантанасцю
на раўнадушша айчыны
Самы час на Бёрнса
Summer time
сказаць запаветнае
твар у твар
ствалу пісталетнаму
сэрца азбукай Морзэ

***

Кожны цырк
пакідаў тут свайго клоўна —
у краіне з надпісам:
«Падлога слізкая!».
А клоўны ўсё падалі
і смяяліся…
Яны больш нічога не ўмелі.
Замест ранішняга сэксу
яны пішуць аб'явы.
Працей напісаць,
чым зрабіць падлогу…

***

Колькі трэба Белак-Стрэлак,
каб адкрыўся шлях?
Цішыня з усіх талерак
снегу на палях.
На канцы секунднай стрэлкі
затрымціць сусвет,
разляціцца на ашкелкі
цыферблата след.
І падковамі парабал
застукоча час,
наступаць на тыя ж граблі
вымушае нас.
Безыменных Стрэлак-Белак
не злічыць арбіт —
кім запоўнены прабелы
нашых Атлантыд?
Значнасць кожнай у сусвеце —
толькі колькасць спроб.
Белай гладдзю па планеце
псы цярэбяць троп.
Альфы яркай ад сузор'я
змрокірве святло,
узнімае вечны дзёран
шляху жарало.
Старажытны задыяку
несупынны бег.
Вочы коцяцца сабакаў
зоркамі на снег.

***

Мацярынская плата
горада
ахоплена шэрым рэчывам
асфальту,
каменю,
бетону
па спіралі сланечніка
запаўняюцца ячэйкі стадыёнаў
уваход —
строга пад нумарам семкі
па нейронах
дарожных сетак
мільгаюць думкамі людзі
у клетках
кватэр трацяць
нервовыя клеткі на андроіды
мужчыны і жанчыны —
дзве паловы
бясконцага саляноіда
біпалярным Неронам
паміж паўночным мостам
і паўднёвым
губляе памяць
у шэрай слоце туману
горад
не помніць
сваёй маці
расплатай
узрываецца ніць напалу
пачуццяў
пачуйце —
аксоны
крычаць клаксонамі
спрабуючы дагукацца
да травы
што вярэдзіць
асфальт прышчаваты
у слязах стаяць кратэры
лужынаў
чакае вясна свайго Бястужава
ды дзекабрысты адцвілі
яшчэ зімою

***

Ноч расцякаецца
гематомай
омы
супраціўляюцца
на рубяжы
на мяжы —
сціхлі музы —
Inter arma silent Musae —*
маўчаць законы,
музы і ягняты…
Ваша слова, таварыш маўзер!
Зацяты,
кашляе — доўга маўчаў
цягаў
ноты з чужога голасу
з міру па ніткі —
лысаму расчоска
«А ў нас аўтамат музычны,
кідаеш грошы —
манеткі лісця…»
скінемся, каб выкупіць
голас зброі
на арэлях надвор'я
будзем танчыць паланэз…

* Калі грыміць зброя, музы маўчаць (лат.).

***

Сабака дырыжуе хвастом,
аблезлы, радасны і рыжы.
Катоў вясновы барытон
рэкламныя ірве афішы.
На нотным стане правадоў
птушыны хор асеў для спеву,
пупышкі будучых лістоў
чакаюць веснавой залевы.
Згубіла станік п'яная вясна
пасля дзявочай пагулянкі,
зімовы келіх выпіўшы да дна,
па горадзе гуляе брукаванкай.
Цукеркай сонца тае за шчакой
і плавіцца ў нябёсах лужын,
разліўшы пераможны неспакой
цяпла пасля пакорнай сцюжы.
Я галавой ківаю ва ўнісон
хадзе зямлі, абуджанай ад цішы.
Сабака дырыжуе хвастом,
аблезлым, радасным і рыжым.

***

Трыццаць хвілін лістапада…
З лета ў зіму — праездам.
Восень каардынаты
у навігатар занесла.

Трыццаць хвілін на сустрэчу
лёс адмярае хціва —
ставіць ў жыцці чалавечым
толькі імператывы.

Трыццаць хвілін лістапада
проста пастой са мною —
нібы на барыкадах.
Быццам прад аналоем.

***

Я крыху Агата Крысці.
Я крыху Моніка Белучы.
Не даверу каву барысце.
Хутчэй цмок ажыве ва Уруччы.

Як не надта ўмелы геймер,
ўсё прымаю да сэрца й на веру.
Падпісаны чарговы дысклеймер —
і пры ўладзе наступная хеўра.

І пад кожным домам — мурашнік,
а пад ложкам — нож для лёду.
Засявае навука пашу,
ды ўзыходзяць чамусь ідыёты.

Нам жыццё адмярае будзільнік,
і дагодліва лжэ тэлепуза.
Інфармацыі строгі ашыйнік
замяніў ярмо прымусу.

Мы — усе з чарнобыльскай шляхты
І з кітайскім камнем на шыі, —
Покуль бавяцца ў розныя пакты
за дзяржавы «браты старшыя».

***

Акрэсленыя ўсцяж
кутамі, межамі, мурамі,
ствараем новыя,
трымаемся за іх,
брыдзем самотным Кафкам
з пляжу Муракамі,
каб стаць ахвярамі
ў аповесцях Няміг.

Закрэсленыя спрэс
свабод абмежаваннем
за кратамі адвечнае віны,
мы проста цягнем час свой
у чаканні
то лета, восені, зімы, вясны.

Знясіленыя, як
адно адрозніць ад другога,
і хочам, і баімся перамен.
Як звыкла быць
маўчком адзінкай ў каталогу —
падачкі атрымоўваць наўзамен.

Зняверaныя, мы
ў жыцця сляпым вар'яцтве
з пясчынкі коцім камень,
як Сізіф.
З усмешкай помсты свету
робім святатацтва
за лёсам дадзены
не той тарыф.

Кінь вечны плач свой
па старонцы ды эпосе
і паглядзі — да гэтае пары
як мужна кожны год
у свет прыходзіць восень,
каб зноў і зноў
загінуць на кастры…

***

Гладжу неба па голай спіне.
А на капоце машыны
прыгрэўся воблак.
Сяджу ўскрай лясной прасекі
і п'ю пеністае прасека.
Татуіроўкі птушыных чародаў
знікаюць са скуры нябёсаў.
Сцягамі чорнымі крычаць вароны,
ім не спасцігнуць сальфеджыа,
спевы для іх — па-за межамі.
Нонканфармістка восень
дыктуе моду на каляровае.
Вясна і лета — зялёныя,
зіма белая ці графічная.
І толькі восень розная —
яна не ведала, што так
было нельга…

Шляхі зямныя



Ігар ШАРАЙ

***

А можа, я прыгрэўся каля Вас?
Мо думаў: не суцешыць, дык накорміць?
Баюся слоў — то вымаўлю не ў час,
То неабходных не магу прыпомніць.

Што за трывога дыхаць не дае,
Якая ноч між намі праляцела?
Баюся сноў — Вы скардзіліся ў сне,
А я ізноў апраўдваўся няўмела.

Скажыце, прападаю ні за грош?
Скажыце, кім міжволі станаўлюся?
Баюся Вас, але ж усё-ткі больш
Сябе, непрадказальнага, баюся.

***

Ушчэнт разбіць увесь набытак,
Адгараваць, адгаманіць.
Маё жыццё — вучнёўскі сшытак,
Дзе ад памылак рабаціць.

Ушчэнт усё, што замінае
Мне зазірнуць за далягляд.
Бяда бясследна не мінае,
Хай не вяртаецца назад.

Хай шлях абраны не разбэсціць,
Каб не разменьваць на грашы
Доўгачаканай гэтай песні,
Што нараджаецца ў душы.

***

Як ты магла? Як мог?
Мо, гэта — пакаранне:
З усіх зямных трывог
Мы выбралі расстанне.

Дрыжыць сярод снягоў
Чый воклік ледзьве чутны?
З усіх зямных шляхоў
Мы выбралі пакутны.

І роспачы не збыць,
Пазбыўшыся палёту.
Няўжо і нам карціць
Прывеціць адзіноту?

Што ж, кожны з нас мастак:
Як можам, так і пішам.
Ды цягнецца няўзнак
Душа да зор і вышай.

Гэй бэн гіном

Пачатак рамана



Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

Бацьку Пракопу, маці Анастасіі, Крэву і Смаргоні

I

Першага ліпеня 1942 года, прачнуўшыся з ранішнім сном, у якім убачыўся яму Хрыстос, Іван Луцэвіч чыста пагаліўся, папырскаўся адэкалонам «Духмяны гарошак», надзеў белую кашулю з цёмна-чырвонымі агатавымі запінкамі, апрануў цёмна-карычневы, тонкага сукна ангельскі гарнітур, абуўся ў новыя, карычневыя на тонкай скуранай падэшве чаравікі, павязаў светла-шэры з цёмна-чырвонай агатавай шпількай гальштук, сунуў у заднюю кішэню штаноў карычневую з чырвонай аблямоўкай насоўку, у левую ўнутраную кішэню пінжака — чорны скураны партманэт з харчовымі карткамі на ліпень, пасведчанне сябра Саюза савецкіх пісьменнікаў і верш-улётку «Беларускія сыны», у правую — яшчэ адзін скураны партманэт, карычневы, з абанементам у сталовую літэр «А», нататнік і аловак з пазалочаным наканечнікам, размеркаваў па бакавых кішэнях партабак з тытунём «Эліт», пушачку з папяроснай паперай, запальнічку, пачаты пачак ізафеніну і, зачыніўшы за сабой дзверы нумара 414 гатэля «Масква», выправіўся ў Саюз савецкіх пісьменнікаў, каб паглядзець, як там яго будуць хаваць, бо тры дні таму, вечарам у нядзелю, яго не стала.

Спусціўся ўніз на ліфце. Яму падабаўся ліфт у гэтым гатэлі: хуткі, мяккі.

«Іван Дамінікавіч! — гукнула яго адміністратарка і падала газету «Известия». — Тут пра вас».

«Дзякуй, — сказаў ён. — Я чытаў».

Такая ж газета з некралогам «Памяці Янкі Купалы» засталася на тумбачцы ў 414-м нумары.

Трызна была прызначаная на тры гадзіны, але ён вырашыў выйсці раней, прагуляцца па Маскве — калі яшчэ давядзецца?..

Дзень быў па-летняму ўтульны. Ён любіў такія мяккія летнія дні, калі сонца не пякло, а лашчыла, і паветра, прахалодна-празрыстае, пераламлялася, як крынічная вада ў крышталёвай шклянцы, і ўсё наўкол іскрылася, і ясным было ўсё да донца.

Колькі ў яго такіх дзён было?.. Палова? Траціна?.. Дзе там!.. На той зямлі, на якой пражыў ён свае шэсцьдзясят гадоў, не надта сонечна. Так што ясных дзён выпала ў жыцці няшмат. А па смерці такі першы выпаў. І добра, што серада.

Ён не задумваўся над тым, чаму добра, што серада — проста з усіх назваў дзён тыдня яму найбольш падабалася гэтая. Якая пасярэдзіне. І ён крочыў скрозь ясны дзень, скрозь сераду, і радаваўся, не задумваючыся, з чаго, чаму?..

Пры жыцці гэтак радавацца рэдка яму ўдавалася, бо амаль заўсёды з радасці ўзнікала вострае адчуванне імгненнасці, матыльковай мімалётнасці жыцця, а праз тое страх, што яшчэ адзін матыльковы ўзмах — і ўсё скончыцца. Страх смерці. А тут вось яна, смерць, у табе, ты ў ёй — і няма чаго баяцца.

Ён нязвыкла сябе пачуваў. Пазачасава і пазасветна. Там, у тым свеце, дзе ён пакінуў жыццё, быў час мінулы, цяперашні, будучы. Былі гады, месяцы, тыдні, дні...

Няспраўджаныя спадзяванні.

Пра няспраўджаныя спадзяванні казаў у ранішнім сне Хрыстос. Казаў, што не страціў веры ў тое, што будзе Божы суд і царства Божае настане, але не тады, калі Ён прарочыў. Што спадзяванні Ягоныя не спраўдзіліся. «Як і твае, — усё выходзячы са сну, у якім з'явіўся, сказаў Ісус. — Не ўсё спраўджваецца не толькі ў людзей, але і ў Бога».

Чаму Ён прысніўся не ў жыцці, а ў смерці?.. Ці гэта не смерць?

Пра тыя гады, месяцы, дні, якія былі да апошніх сноў, Купала помніў. Але цяпер іх, асобных гадоў, месяцаў, дзён не было — усе часы былі ў адным часе. І нельга сказаць, што ў цяперашнім. Час гэты ўвогуле немагчыма было вызначыць, яго як бы не існавала. Нагэтулькі не існавала, нібы ён не пачынаўся і не скончваўся, і ён не мог пачацца і скончыцца — і Купала падумаў, што гэта вечнасць.

Бог прысніўся ў вечнасці?..

Вечнасць прыснілася ў Ім?..

Як раней, так і цяпер ён уявіць не мог, што такое вечнасць, але падумаў пра яе, бо, мусіць, толькі ў вечнасці можна сябе гэтак пачуваць. Ясна і бясстрашна.

Усе апошнія гады ён пражыў у страху, які ціснуў то мацней, то слабей, але не адпускаў. Гэта высмоктвала, выбірала ўсе сілы, і ўрэшце ён адчуў, што ўжо не столькі збаяўся, колькі стаміўся баяцца. Вось тады і стала яму ўсё адно, што з ім будзе далей.

А што далей будзе?..

Хрыстос казаў, што таксама не ведаў, што з Ім будзе далей. Бо да таго, як стаць Богам, быў паэтам.

Калі становішся Богам, паэтам быць ужо не можаш?..

Ягоныя вершы сталі казаннямі ды прароцтвамі? І Святое пісанне — гэта вершы Ягоныя, перапісаныя прарокамі?..

«Я напісаў верш пра Божы агонь, які не гасне ў вадзе. Прачытаў яго падарожніку, і ён сказаў, што я паэт, і што шлях мой на Іярдан да прарока», — успомнілася прамоўленае Хрыстом, які казаў яшчэ пра дом, пра маці, пра тых, каго любіў, і ад каго сышоў, не развітаўшыся, бо быў пакліканы.

Калі ты пакліканы, ты мусіш усіх пакінуць?..

Можа, павярнуць да Ільінкі — і на Кацельніцкую? Развітацца па-людску. У той вечар, калі яго не стала, гэтак не выйшла, як ён хацеў.

Выйшла як выйшла...

Ён павярнуў да Ільінкі, ступіў крок-другі — і ўявіў, як тая жанчына, ад якой ён сыйшоў, не развітаўшыся, спалохаецца. Збіраецца, пэўна, на пахаванне, а тут ён, нябожчык.

Не, так нельга. Хай прыйдзе, як усе, паплача з усімі... І ён павярнуў да Кавальскага маста.

Трохі падціскалі, мулялі зверху, націраючы костачкі на ступках, новыя чаравікі, у якіх тры дні таму йсці было балюча, а цяпер — нічога. Можна шпацыраваць.

Ён любіў шпацыраваць. Ідучы, намацваў рух радка. Рытм, хаду верша...

Недзе ў ім блукала паэма пра сны.

Першы сон па смерці, у якім Хрыстос сказаў, што быў пакліканы на Іярдан да прарока Яна Купалы, здзіўляў, але так не трывожыў, як апошні сон пры жыцці.

Тры дні таму, у ноч на 28-е, апошнюю ноч у тым, які можна было палічыць, часе, ён бачыў сон, пра які, памёршы, забыўся, а сёння, убачыўшы ў ранішнім сне Хрыста, успомніў.

У тым начным сне ў 414-ы нумар, у якім ён жыў у гатэлі «Масква», увайшоў з выгляду блазнаваты, у лётным шлеме з чырвонай зоркай, чалавек. Ён быў падобны да гандляра з ГУМа, якому надпісаў летась Купала кнігу «Ад сэрца». Сеў на ложак, у ногі сеў: «Што ты робіш?». Купала спаў, таму адказаў: «Сплю». Той спытаў: «А чаму ты спіш?» — і Купала ў сне прамовіў так, як не адказаў бы на яве: «Бо мне ўжо не цікава не спаць». Тады чалавек той у лётным шлеме з чырвонай зоркай, які да ўсяго яшчэ й рознавокі быў, колер вачэй ягоных Купала не запомніў, але яны былі рознага колеру, перасеў бліжэй да ўзгалоўя, нахіліўся да вуха: «Заўтра ты не прачнешся, але і спаць не будзеш». З тым падняўся і пайшоў. Нават не пайшоў, а неяк так, як бывае ў снах, знік.

Як гэта: і не прачнешся, і не будзеш спаць?..

Той апошні ў жыцці сон быў з суботы на нядзелю. А з суботы на нядзелю, як было напісана ў старадаўнім сонніку, які ляжаў некалі на століку каля ложка маці, сніцца тое, чаго хочацца.

Вечарам у нядзелю яго не стала.

Можа, усё ж павярнуць на Кацельніцкую?.. Раптам жанчына тая, з якой не развітаўся, не пойдзе на пахаванне? Зазлуе, што яго не стала. Ці пабаіцца.

Ён ужо вырашыў павярнуць, яму хацелася сказаць ёй, каб не вінавацілася, бо ўсё адно было б так, як сталася, але на падыходзе да вуліцы Кавальскі мост два чалавекі ў чорных капелюшах упіхнулі яго ў чорную машыну і завезлі на Лубянку. У Камітэт дзяржбяспекі. Ехаць было зусім недалёка — і ён падумаў, калі прывезлі: «Нашто машыну ганялі? Не таму ж, што мне чаравікі муляюць. Вайна, а яны бензін паляць...».

II

Віктар Маргер прысніў, што яго спалілі.

Прачнуўшыся сярод ночы ад прысненага кашмару, падумаў, што дарма ён гэтак рупіўся, каб пасяліцца менавіта ў тым нумары гатэля «Масква», у якім пражыў апошнія дні свайго жыцця Янка Купала. «Тут пахне згубай», — сказала Ганна, як толькі ўвайшла сюды, і калі ён перапытаў: «Смерцю?..» — яна паўтарыла: «Згубай. Гэта розныя пахі».



Фота www.tut.by

Сярод усіх кашмарных сноў, якія тут яму ўбачыліся, сённяшні быў найкашмарны. Каб пазбавіцца яго, ён уключыў таршэр і, пасунуўшыся на край ложка, паглядзеў на Ганну, у якой была звычка спаць на падлозе. «Я твая сука», — казала яна, калі ён пытаў, чаму? — «Але ж і сукі спяць з гаспадарамі на ложках...» — «Гэта хатнія. А я сука дзікая».

Ганна спала, як звычайна, на баку, падабраўшы пад жывот калені, і дыхала ціха, роўна, спакойна. «Сны, — яна казала, — мне не сняцца. Ніякія. А калі сняцца, я іх не помню. Затое я помню ўсё, што не сны».

Так. Усё, што не сны, яна не забывала. І яшчэ яна казала, што звычка спаць на падлозе ў яе ад маці. «Не ведаю чаму, але маці не спала ў адным ложку з бацькам. Клалася каля ложка на падлозе».

Віктар падняўся, падышоў да вакна, каля якога стаяў на трыножніку тэлескоп, у які глядзеў ён у гэтым нумары ўжо больш за месяц. І цяпер зірнуў — цямнеча.

Марозна скончваўся люты — цёмна пачынаўся апошні лютаўскі дзень. За вакном было так змрочна, так густа чорна, што гэтую густую цемрадзь не прабівалі нават агні сталіцы, якія, здавалася, замерзлі на яе галоўнай вуліцы і галоўнай плошчы.

Цьмяным золатам пабліскваў перад акном тэлескоп. Віктар займеў яго праз 300-ю секцыю — закрыты размеркавальнік на Кутузаўскім праспекце, куды выдалі яму запрашэнне ў Сенацкім палацы Крамля, дзе мясцілася Упраўленне справамі Савета міністраў СССР, якім кіраваў флегматычны чалавек з зоркай Героя Сацыялістычнай Працы, з прозвішчам Смірцюкоў і мянушкай Смерць. «Ого!..» — сказала Ганна, убачыўшы подпіс на запрашэнні, і проста зацягнула Віктара ў тую 300-ю секцыю, «дзе ёсць такое, пра што ты нават не ведаеш, што яно ў свеце ёсць!» — і дзе да іх прычапіліся: «Што б вы хацелі купіць?».

Ён нічога не збіраўся купляць, таму сказаў, што тэлескоп. З залацістай трубой. Такі, пра які марыў у дзяцінстве. Проста так сказаў, каб адчапіцца і каб адчапіліся, а яму паказалі каталог з фотаапаратамі, біноклямі, тэлескопамі: «Выбірайце».

Такога тэлескопа, які ён хацеў бы мець, у каталогу не знайшлося, але дырэктарка секцыі ўспомніла: «Па-моему, у нашай краме антыкварыяту я нешта такое бачыла. Гэта не тут, у ГУМе... — Патэлефанавала і трубкай бразнула. — Ёсць! І ведаеце, што... Кажуць, што ён быў сярод асабістых рэчаў Сталіна. Нават карціна напісаная, на якой Сталін у той тэлескоп глядзіць. Можаце і карціну купіць, яна таксама там. Звычайна такія рэчы, — зірнула яна на Ганну, — мы толькі сваім прадаем, але калі запрашэнне з подпісам Смерці...».

— Дык мы і ёсць свае! — дагаварыла за яе Ганна і павезла Віктара ў ГУМ, дзе ў антыкварнай краме 300-й секцыі ім не прадалі, а падаравалі тэлескоп разам карцінай.

Дырэктар крамы, які зрабіў ім гэтыя падарункі, быў, пэўна, гіпнатызёрам. Інакш немагчыма патлумачыць тую фантасмагарычную дзею, якую ён для іх наладзіў. Яе проста не магло быць у звыклым свеце, але яна была. Больш за тое: яны ў ёй удзельнічалі, пра што сведчылі шмат якія рэальныя рэчы — найперш карціна і тэлескоп.

Тэлескоп напраўду быў марай ягонага дзяцінства. Мястэчка, дзе ён нарадзіўся, стаяла на ўзвышшы, там трохі бліжэй было, чым у іншых месцах Беларусі, да неба, і там яно было яснейшае, чым у іншых месцах. А ўночы такое зорнае, як болей нідзе.

Летам ён спаў на сене ў пуні, саламяная страха якой была ўся ў дзірках. Гледзячы ў іх, ён падарожнічаў ад дзіркі да дзіркі, ад галактыкі да галактыкі, уяўляючы, якія дзіўныя на планетах у тых галактыках лясы і сады, звяры і птушкі, рыбы і людзі, і калі засынаў пад раніцу, дык лятаў у тыя галактыкі на тыя планеты і бачыў тых дзіўных рыб і птушак, звяроў і людзей, сярод якіх амаль заўсёды з'яўлялася паненка ў белай сукні з чырвоным поясам, якая кожны раз пытала, як яго

зваць, а ён быў у такім захапленні ад палёту, ад дзівосаў, якія бачыў, што забываў, не памятаў свайго імя — і ніяк яны не маглі пазнаёміцца. Таму ён проста кінуўся, рынуўся знаёміцца з Ганнай, калі ўбачыў яе ў белай сукенцы з чырвоным поясам…

Ганна была падобная да той паненкі. Да іншапланецянкі. Пасля аказалася, што яна насамрэч жыла на іншай планеце, жыхары якой карысталіся паслугамі не толькі 300-й секцыі, у антыкварнай краме якой можна займець у падарунак музейны тэлескоп. І Віктар здагадваўся, што падарунак яму зрабілі зусім не таму, што ён меў запрашэнне ў тую секцыю, «дзе ёсць такое, пра што ён нават не ведаў, што яно ў свеце ёсць», а таму, што прывезла яго туды іншапланецянка. Свая.

Ён зацягнуў іншапланецянку ў двор літаратурнага інстытута, у якім тады вучыўся, у падвал дома ў двары, дзе начаваў, падрабляючы качагарам, і дзе яны пілі з бутэлькі, на якой была наклееная самаробная этыкетка «Calvados», таннае, якое піць было немагчыма, яблычнае віно, а пасля ён да раніцы чытаў ёй, бо яна раптам папрасіла, беларускія вершы, і калі прачытаў Купалаў, яна сказала: «Мая маці была з ім блізкая. Настолькі блізкая, што… магчыма…» — «Што?.. Што магчыма?..» — паспрабаваў ён яе, сонную, расштурхаць, а яна з тапчана, на якім спаў ён у качагарцы, слізнула на чорную, усю ў вугальным пыле, падлогу. Ён падумаў, што ёй проста цесна з ім на тапчане, падняўся: «Кладзіся, я на падлозе лягу», — але яна ўжо заснула. На баку, імгненна, падабраўшы ногі да жывата.

З гэтага ўсё й пачалося. І падняўся з падвала качагаркі да нумара ў гатэлі «Масква». А там, тады, прачнуўшыся апоўдні на падлозе ў качагарцы, Ганна дагаварыла тое, з чым апоўначы заснула: «Я, магчыма, ягоная дачка…».

— Ну-ну, — дапіў ён недапіты ўчора, бо яго немагчыма было дапіць, самаробны, куплены на Рагожскім рынку «Calvados», які з'явіўся і на Рагожскім, і на іншых рынках з кніг Хэмінгуэя, фотапартрэты якога віселі нават на кухнях гандляроў. — А чаму «магчыма»?

— Бо ў той час маці блізкая была…

Яна запнулася, ён спытаў:

— Не з ім адным?

Ганна ўскочыла.

— Дзе тут памыцца? Вада ў тваіх апартаментах ёсць?

— За печчу кран.

Яна пайшла за печ і адтуль, плёхаючы вадой, што цякла з крана ў праіржавелую балейку, сказала: «Са Сталіным, з Берыем…».

Ён нават не падумаў, што яна кажа пра тых, з кім блізкая была яе маці.

— Што са Сталіным з Берыем?

— Тое, пра што ты спытаў…

Ганна выйшла мокрая, кроплі вады між палоскамі не дарэшты змытага вугальнага пылу дыяментамі бліснулі ў сонечных, што раптам каса ўпалі з вакенца пад столлю, промнях, — такая дыяментавая зебра.

Яна была трохі старэйшая за яго, але выглядала, як толькі што створаная Ліліт.

— Ты думаеш, што я прыпыленая?

Што ж, калі нават… У літінстытуце ён да такіх ужо звык, нармальныя на аддзяленні паэзіі амаль не сустракаліся.

Адна імпульсіўная паэтка, якая, убачыўшы яго з вакна на чацвёртым паверсе літінстытуцкага інтэрната, раптам закрычала: «Хочаш, каб у імя нашага высокага кахання я ўніз скочыла?» — і калі ён абыякава, бо ніякага кахання, ні высокага, ні нізкага не было, кіўнуў: «Скачы, калі хочаш…» — рынулася сторч галавой і жывая засталася, бо ненармальных Бог шкадуе.

Потым яна пра сустрэчу з Ахматавай распавядала. Як прыехала ў санаторый, дзе Ахматава памірала, прачытала ёй вершы. Тая заплакала, абняла яе: «Ты — мая дачка, блаславляю цябе на высокае служэнне рускай паэзіі. А мне час». І ў яе на руках памерла. «Я таму і не забілася, калі з чацвёртага паверху скочыла, бо ў мяне служэнне…»

Ні зебры, ні лані, ні лісы вершы не пішуць і з глузду не едуць. Ён абняў Ганну, зебру: «Я думаю, Ганя, што табе нельга піць самаробны кальвадос».

Яна пацепнула плячыма так, як пацепвае чалавек, якому ўсё адно, верачь яму ці не, вызвалілася з ягоных абдымкаў, дастала з сумачкі, кінутай учора пад тапчан, залаты медальён, на якім, нібы кропля крыві, чырванеў маленькі рубін: «Вось… Паглядзі…». Падняла вечка — і з медальёна, з партрэта на белай эмалі вочы ў вочы Віктару зірнуў Купала.

— Яна памерла з гэтым медальёнам на грудзях. Казала, што нядоўга, але і Купала яго насіў. З партрэтам Сталіна. Толькі я не зразумела, чаму? Ён жа не быў сталінцам. Проста вершы пісаў…

Так. Проста вершы пісаў.

Віктару было ўсё адно, кім яшчэ быў Купала, апроч таго, што быў паэтам. І датуль гэта яму ўсё адно было, пакуль адзін былы зэк у запалярным горадзе Нарыльску не сказаў, калі яны пра смерць Купалы загаварылі: «Ён двойчы памёр. Спачатку паэзію пакінуўшы, а пасля — кінуўшы маці. У першыя дні вайны ў Мінску, калі горад ужо гарэў. Жонку ўзяў, транты ўзяў, а маці кінуў! Ты б кінуў сваю?..»

Гэты былы зэк, Грахавец, таксама паэт, меў за спінай 20 лагерных гадоў, у чым вінаваціў усіх — ад Сталіна да Купалы, «якому ў гэты час медалі чаплялі і прэміі выдавалі! За што?!. — гэтак выдыхаў Грахавец, нібы спірту хлебануў. — Дваццаць апошніх гадоў — спрэс сталінскія агіткі! Нібы не ім, іншым чалавекам напісаныя. Але ж гэта ён, не я пісаў!..».

Зразумела было, што ў Грахаўцы крычыць крыўда, але ж і праўда таксама: маці сваю Купала, пакідаючы Мінск, с сабой не ўзяў. Магчыма, яна не хацела ехаць. Куды і па што? Са свайго жыцця, якое ўжо скачвалася…

Але магчыма, што і не…

Так ці інакш, але адносіны Віктара да Купалы ўскладніліся. Да праблемы кінутай маці дадалася, — хоць ён гэтага не хацеў, гэта замінала яму чыста чытаць Купалу, чыста любіць яго, — праблема пакінутай паэзіі. Праблема агітак, «дрындушак», як зняважліва пра тое, што напісаў у апошнія гады, а значыць, зневажаючы самога сябе, казаў Купала. Разумеў, што ён піша, і пісаў. Самазневажаючыся. Чаму?.. Страх, грошы, званні, прэміі, — усё яно так, усё нібы відавочна. Але чаму?..

Гэтага Віктар не ведаў. Як не ведаў і таго, чаму так важна яму знайсці адказ на гэтае пытанне.

Пад той час ён ужо аб'ездзіў Савецкі Саюз па яго найдальніх кутах і закутках, пабачыўшы на Сахаліне і Камчатцы, у Сібіры і на Поўначы такое, пра што ні ў якіх кнігах не прачытаеш, што ніяк не супадала з ягонымі ўяўленнямі пра краіну, у якой ён нарадзіўся і жыў. Праз тое паўзнікала процьма пытанняў куды важнейшых за літаратурныя, бо гэта былі пытанні жыцця, якія патрабавалі зразумелых, ясных адказаў, але ў той краіне, у якой жыў, у тым свеце, у тым жыцці, якое звярэла наўкол, з грубай сілай варочаючы, як камянямі, чалавечымі лёсамі, ён адказаў не знаходзіў. Тады пачаў шукаць іх у самім сабе: паспрабаваў пісаць. Аказалася, што для яго гэта найлепшы спосаб пошуку. І аднойчы падумаўшы пра літаратуру як пра магчымы занятак жыцця, паехаў з Нарыльска ў Маскву, дзе паступіў у Літаратурны інстытут.

Установа была прэстыжная, на аддзяленне паэзіі набіралі ўсяго дванаццаць чалавек, а ў Савецкім Саюзе кожны пастух і бухгалтар вершы пісалі, так што даваліся вытрымаць вялізны конкурс, каб даволі хутка зразумець, што ў інстытуце тым можна было і не вучыцца. Але, калі б не вучыўся, не хадзіў бы ён па кантрамарках, якія выдаваліся студэнтам літінстытута, ва ўсе маскоўскія тэатры, у адным з якіх, тэатры на Таганцы, і пазнаёміўся з паненкай у белай сукенцы з чырвоным поясам, якая назвалася Ганнай і сказала, што яна дачка Купалы. А калі не Купалы, дык дачка ці Берыі, ці Сталіна…

Праз дзесяць гадоў пасля іх знаёмства ў тэатры, Віктар увайшоў у 414-ы нумар гатэля «Масква», дзе сорак гадоў таму дажываў свае апошнія дні Купала, са сталінскім тэлескопам. Паставіў яго каля вакна, глядзеў то на Маскву, то ў неба, якое сцякала пад ноч на захад, тупаў у нумары з кута ў кут і ўсё спрабаваў уявіць сябе на месцы Купалы ў гарачым чэрвені 1942 года, калі яго выклікалі з Казані, дзе ён быў у эвакуацыі, пасялілі ў гэтым гатэлі і нібы забыліся, дзеля чаго выклікалі. 60-годдзе ягонае адзначыць? Дык чаму пра гэта ніхто ні слова? А вось пра тое, што немцы ў нейкай газеце ў Мінску надрукавалі побач з партрэтам Гітлера ягоныя вершы і назвалі ягоным іменем вуліцу, на якой ён жыў, сказалі…

Гэтую вуліцу ягоным іменем збіраліся назваць яшчэ да вайны. Бальшавікі, не немцы. Але чамусьці перадумалі. І вось цяпер…

Можа, яго прывезлі, каб пакаяўся?..

У Казані ўжо змушалі пакаяцца. Нават напісалі тэкст пакаяння. «Немцы, гэтыя крывавыя дзябля яшчэ прабуюць прыкідвацца нявіннымі авечкамі і спекуляваць сумленнымі і чыстымі імёнамі! Кажуць нават, што яны вуліцу, па якой я жыў у Мінску, назвалі маім імем…»

Ён не стаў гэты тэкст зачытваць. Тады яму сказалі, што трэба ехаць у Маскву. Для чаго?.. Каб ён тупаў з кута ў кут у гэтым нумары і думаў: калі свае не захацелі вуліцу ягонымі іменем назваць, а ворагі назвалі, дык хто ён цяпер для сваіх? У час, калі вайна, калі Мінск пад немцамі, а немцы пад Масквой? І невядома, колькі вайна працягнецца, калі і чым скончыцца?..

Навошта яго выклікалі ў Маскву з Казані?!.

Ніхто ж нічога не кажа! Ніхто нічога!.. Робяць выгляд, нібыта ўсё так і павінна быць. Нібы так і трэба: выклікаць з Казані, пасяліць у гатэлі і забыцца, дзеля чаго выклікалі…

І так з дня ў дзень. З ночы ў ноч. Нехта стукне ў дзверы — ён сцінаецца, баіцца спытаць: хто?.. Бо як да вайны, гэтак і ў вайну ў Маскве арышты, арышты, арышты… Шпіёны, здраднікі, ворагі народа…

У дзверы нумара пастукалі, Ганна ўскінула галаву: «Хто?..». Віктар падышоў да дзвярэй: «Хто там?..». — «Пакаёўка. Вы прасілі кашулю на сёння папрасаваць». — «Прасіў. Але ж не ўночы». — «Дык у вас свята. Падумала: можа, збіраецеся…».

Ён адчыніў дзверы — за імі, адсунуўшы ўбок пакаёўку, паўсталі двое міліцыянтаў. Адзін прайшоў у нумар: «У вашым нумары ў начны час староння. — І ступіў да Ганны, якая як ляжала, гэтак і засталася голай ляжаць на падлозе. — Дакументы!».

Міліцыянт стаў пры таршэры каля тумбачкі, на якой ляжала чырвонае, з фотакарткай і пячаткай пасведчанне дэлегата XXVI з'езда КПСС. Зірнуўшы на фотакартку, на Віктара, міліцыянт казырнуў: «Выбачайце!» — і спіней выйшаў з нумара, акуратна зачыніўшы дзверы, з-за якіх пачулася: «Ты што!.. Падставіць нас?..».

— Гэта простым савецкім грамадзянам простую савецкую прастытутку нельга мець, — ускінулася на ложак Ганна. — А дэлегату XXVI з'езда КПСС можна мець прастытутку з тэлескопам! — І ўхапіла яго за руку, пацягнула да сябе. — Уф!.. Ну ты й пахнеш… Як цырульнік…

Яна была нястомная ў любові… Неспатольная… А пасля балбатала абы што. Напрыклад, што яе маці ў ложку Леніна кахалася. Не з Леніным, гэтага яна не казала, але ў ягоным ложку. З Купалам. «Магчыма, што ў тым ложку я і была зачатая».

Ленінка.

У іх тут, у Маскве, не толькі ў кожнай акторкі, а ў кожнай гандляркі і цырульніцы была свая тэатральна-літаратурная гісторыя. Абавязкова амурная.

Учора Ганна завяла яго ў цырульню на плошчы Маякоўскага. Цырульня называлася «Агні Масквы», і там школьная сяброўка Ганны шчабятала, нажніцамі чыкаючы: «У гэтай цырульні яшчэ бабуля мая стрыгла, яна каханкай Маякоўскага была, ён у яе пастрыгся, потым пайшоў і застрэліўся… вы бачылі фота, на якім ён у труне… о, як пастрыжаны!.. ніхто б яго так не пастрыг, як мая бабуля… а маці стрыгла Талстога… не таго, які «Вайна і мір», а які… забылася, як кніга называецца… кіно яшчэ па ёй глядзела… але таксама, як называецца, забылася… ну, вось і ўсё… глянь, Ганна, які ў цябе прыгажун… хоць у кіно здымай… спадзяюся, не застрэліцца… зараз мы яго яшчэ й асвяжым… «Одеколон "Огни Москвы", чтобы Москвою пахли вы!..» — гэта Маякоўскі напісаў, пасля яму помнік каля нашай цырульні паставілі…» — і калі Ганна спытала: «За рэкламу адэкалона?» — сяброўка не пачула ў тым ніякага жарту. «Магчыма. А што?..» — «Нічога. Ты выпадкова не помніш, што ён яшчэ напісаў?..» — і яе знаёмая цырульніца Соня сур'ёзна адказала: «Як што?.. Паэму пра Леніна… І нешта там пра савецкі пашпарт…»

Пра Леніна паэму. І пра савецкі пашпарт нешта.

З цырульні Ганна павезла яго на пахаванне даўняга сябра яе бацькі. «Паехалі. На пахаванні будуць людзі, якія не бываюць нідзе».

Ён зразумеў, пра што яна сказала, але перапытаў: «Нідзе, апроч пахаванняў?..»

«Ён яшчэ і мой хросны, — як бы не расчула яна не надта ўдалы жарт. — Ніхто пра гэта не ведае, маці ўпотай мяне хрысціла. У Малым саборы Данскога манастыра. Назвала Ганнай, бо ў нашым родзе ўсе жанчыны Ганны».

Паехалі ў Данскі манастыр. Віктара здзівіла, што там, у Першым маскоўкім крэматорыі, яшчэ гарэць печы. Ён чуў, што працуе новы, Мікола-Архангельскі крэматорый, а крэматорый у Данскім манастыры зачынены. «Для ўсіх, — сказала Ганна. — Але не для тых людзей, якія там будуць. Яны могуць, калі захочуць, хоць усе ў тым крэматорыі спаліцца. — І нібы пажартала ў адказ на ягоны няўдалы жарт. — А ты не хочаш?.. У той жа печы, у якой Купалу спалілі».

Вось праз гэта, мусібыць, і ўбачыўся сон. Праз тое, што яна так сказала…

Прыснілася, нібы ён прыйшоў у крэматорый і сам лёг у печ, у якой спалілі Купалу, і сам жа, неяк аддзяліўшыся ад сябе самога, глядзеў, як ён, паэт Віктар Маргер, а не паэт Янка Купала, згарае. Як спачатку лопнулі вочы, потым праз вачніцы, праз рот, праз вушы пачала выкіпаць кроў, галава адкінулася назад, шво чэрапа разышлося і зеленаватым полымем запаліліся мазгі, і тут нейкая жанчына, не Ганна, іншая нейкая, пачала прасіць, за ягонай спінай стоячы і чамусьці Янкам яго называючы: «Не глядзі, Янка, не глядзі…» — і далонькай спрабавала засланіць яму вочы, а ён адводзіў яе руку, не мог адарвацца ад жахлівага, якое магнетычна прыцягвала, відовішча, адхіснуўшыся толькі тады, калі тулава ў печы прыпаднялося, скрыжаваныя рукі раскінуліся, абнялі яго полымем, у якім ён згараў… «Гэй бэн гіном», — пачуўся аднекуль чыйсьці голас, і з гэтымі словамі ў тым полымі ён прачнуўся…

Пякельна балела ў грудзях, у якіх толькі што згарэла, попелам рассыпалася ягонае сэрца.

— Гэй бэн гіном, — прытуліў ён да грудзей Ганну. — Ты чула такое? Што гэта?

— Чула… У Ерусаліме нешта.

— Скуль ты ведаеш, што ў Ерусаліме?

— Была там. Здаецца, гэта гатэль. Ці..

— Ці што?

— Не помню. Якая розніца, што?

Калі б не сон, не голас, дык ніякай.

— Нейкі ты ўскаламучаны з ранку, — на цырлах прайшла Ганна ў прыбіральню. — А табе сёння, як ніколі, спакойным трэба быць. Як па смерці.

Нібы яна ведае, як яно там — па смерці — бывае.

Цалкам раман можна прачытаць у сёлетніх нумарах часопіса «Дзеяслоў»



Фота Канстанціна Вінаградава

Каін і Герда



Вадзім КОРАНЬ

У чужую душу не зазірнеш.
Чужую душу не ўведаеш.
Яна чорная?
Ці белая?
Празрыстая?
Ці чырвоная?

Цёплая?
Халодная?
Лёгкая?
Лагодная?
Крохкая?
Цяжкая?
Якая ж ты, душа чужая?
А свая душа якая?

Тым часам Герда Кая шукае,
а ў Кая душа нямая.
Герда не ведае,
Герда спяшае
і Кая гукае...
А можа Кай цяпер —
Каін?

Слова «ВЕЧНАСЦЬ» складаю
з дробных кавалачкаў лёду,
седзячы на халоднай падлозе
ў доме, поўным адчаю —
змярцвелыя некалі атамы
вадароду і кіслароду
цяплом сваіх рук
і дыханнем сваім ажыўляю.

Герда, сказалі, што сёння
зноў будзе дождж.
Зноў нашы сляды на зямлі
пазмывае даждажамі,
але гэта звычайна,
бо даўно ўжо даводзіцца жыць
між даждом,
што шуміць за акном,
і старымі крыжамі.

Маўчанне закрэсленых словаў
цярпець зусім немагчыма.
Попел спаленых думак маіх
ляжыць на тваім партрэце.
А мой анёл-абаронца
крылы за худымі плячыма
з цяжкасцю нясе
дзесьці па людным праспекце.

Герда, я даўно жыву
са знакам «анты-» на душы.
І гэта страшна, нібы хвароба
на неаперабельную анкалогію.
Калі зможаш, забі мяне, Герда,
забі, атруці, задушы,
а са мной — маіх дэманаў,
страхі, сумненні, прылогі...

Лямпа цярушыць нямое святло
на падлогу —
начное жоўтае пекла
ў асабістым карыстанні.
Сёння праграма без зменаў —
жальбы да Бога,
корпанне ў кволай душы
і сама-
ўкрыжа-
ванне.

Грукае ў шыбу танюткаю голкай
маланка
і піша на шкле слова «ЧАС»,
бы пяром на паперы.
«Час... Час... Час...» —
не спыніць гадзіннік
свой шэпат да ранку...
«Час... Час... Час...» —
вецер нахабна грукоча
ў замкнёныя дзверы.

Некалі сонца было маладым. Ад ягонага святла можна было адрэзаць скібачку, забраць з сабою і пакінуць на ноч у хаце, каб на сценах з'яўляліся цені, якія маглі размаўляць. Але цяпер цені не размаўляюць. Цяпер цені знямелі. Толькі здзіўлена і падазрона пазіраюць са сценаў, падлог і століў на свечкі, лямпы, таршэры...

Цень, як тваё імя, Цень?

Цішыня. Цені маўчаць. Маўчаць і чакаюць, калі хоць хтосьці зразумее іх маўчанне. Маўчаць і паміраюць на світанні...

Герда, я пачну паміраць заўтра.
Ты будзеш побач?
Цяжка, калі адзін...

Дванаццаць доўгіх гадзін,

якія цягнуцца чорнай вышыўкай
па белай смяротнай кашулі,
завязваючца ў вузельчыкі,
нібыта на доўгую памяць,
паўзуць па цыферблатах,
калі ўсе даўно паснулі,
імгненні, нібы суніцы,
адна да адной збіраюць.

Дванаццаць доўгіх гадзін

варушацца ў чорных дзірах
балючых і злых успамінаў,
чакаюць у лабірынтах
чарговых жахлівых сноў,
ляжаць на вечках старых
спарахнелых даўно дамавінаў,
хаваюцца на паддашках
нічыйных забытых дамоў.

Паўзуць па закінутым Садзе
дванаццаць доўгіх гадзін...

Яны ўсюды пакінуць свой след —
на пяску і бетоне,
на траве, камянях, на асфальце
і на брукаванцы.
І ад іх не схавацца
ні ў сонца святле, ні ў сутонні
цёмных фарбаў начных,
ані ў бляклай асеннняй раніцы.

— Vipera! Vipera! Vipera!
Vipera! Vipera! —
крычма крычыць усё жывое
і ратунку дарэмна шукае.
На абразáх у чырвоных кутах
павуцінаю — шэрань,
а свечкі чадзяць і дарэшты
ніяк не згараюць...

«Час-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с...»
«Час-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с...»
«Час-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с...» —
чуецца ў адказ.
«Час-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с...»
«Час-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с...»
«Час-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с-с...»

А таею хвілінаю па цёмнай сцэне Купалаўскага тэатра прайшоў навечна дваццацічатырохгадовы Язэп Васілеўскі. Але не заспяваў, як калісь, а сціпла сеў на край сцэны. Дыханне ягонае было цяжкае, як Барысавы камяні, а ў руках — свечка, якая асвятляла ягоны ссохлы твар. «Прабачце, што я пакінуў вас раней, чым мог... Час...», — прашаптаў ён, паглядзеў у халодную змрочную залу і ўбачыў, што на пустыя крэслы падаюць сняжынкі. Яны ўсё ляцелі і ляцелі з-пад столі, пакрысе ператвараючы залу ў белую паперу, на якой можна было б напісаць новае жыццё...

Што зменіцца ў свеце,
калі мы дажывем да заўтра?
Але зноў прачынаемся ў сёння
пад крык самазваных суддзяў...
Калісьці даўно ў Парыжы
мы размаўлялі з Сартрам,
і тады ён заўважыў, што пекла —
гэта іншыя людзі.

Мы стаялі на Пэр-Лашэз
хмарным даждлівым днём,
глядзелі, як плача анёл,
і ледзь не плакалі самі.
Ён сказаў: «Гэты камень ніколі
не ўведае, што ён — анёл,
а гэты анёл ніколі не ўведае,
што ён — камень».

Вецер граў на струнах дажджу
блюз да болю маркотны.
Здаецца, нібы сам Бог
узяў раптам у рукі гітару —
у прасторы і часе
плылі нечуваныя ноты,
а дажджынкі, бы слёзы памерлых,
збягалі па твары...

Аднойчы чалавек пачуў дзіўную музыку, нібыта ўсе гукі сусвету зліліся ў адно цэлае, але кожны з іх меў сваё вызначанае месца.

Музыка была то прыгожая, то жахлівая, то гучная, то ціхая, то гаваркая, то маўклівая, то светлая, то цёмная...

І толькі ў апошні дзень жыцця ён зразумеў, што кожны той гук, кожнае тое сугучча — водгалас душ памерлых людзей. Зразумеў — і сам стаў фа-мінорам у Вялікай Сімфоніі Невядомага Аўтара.

Герда, я ўчора прыдумаў
на дзіва страшную казку,
страшную, як рэчаіснасць,
і, можа, крыху таямнічую.
У ёй у герояў на тварах
самаробныя маскі,
каб ніхто не ўбачыў пад імі
іх сапраўдных абліччаў.

Яны ў сутарэннях сядзяць
і паляць юнацкія мары.
У кожнага свой агонь,
які дарэшты знішчае.
Не могуць зняць маскі,
што папрыраслі да твараў,
і вар'яцеюць самотна
ад страху нямымі начамі.

А яшчэ яны нешта крычаць
(толькі яшчэ не прыдумаў, што.
Напэўна, хтосьці просіць святла,
а хтосьці — ад болю, здзіраючы маску).
Але ў выніку ўсе жывыя,
і пакуль не памёр ніхто.
Магчыма, гэта і ёсць
шчаслівая развязка?..

Заўтра сонца згасне і вялізным вандроўным дыяментам пакоціцца па цёмнай галактыцы, шукаючы сабе прыгожую аправу сярод планет, якія яшчэ не маюць імя. Настане вялікая зорная ноч. Мільярды зямных вачэй удзень убачаць святло памерлых, але для іх жывых яшчэ зорак. Убачаць чорныя дзіры — тунэлі ў невядомасць. Убачаць астэроіды, што бясклапотна ляцяць і будуць ляцець па сваіх, кімсьці дакладна акрэсленых шляхах.

...2675, 2919, 2981, 3047, 3001, 4457, 5889, 4147, 2734, 3283, 3104, 2999...

Апошні чалавек на зямлі перад смерцю ўбачыць вялікія сінія вочы далёкага, маладога, новага свету. Дзе ўсё будзе іншым. І новым. І заззяе новае сонца. І народзяцца новыя людзі. Адам і Ева. І ў іх народзяцца дзеці. Каін і Авель...

Герда, на далёкай планеце
ў галактыцы невядомай,
дзе можна ў небе рукою
злавіць і пагладзіць камету,
мы будзем сядзець і глядзець,
як агорнуты стомай
знікае за далягляддам
самотны і стомлены вецер.

Больш не трэба ніякіх словаў,
усё і без іх зразумела:
я — у светлым гарнітуры,
ты — у сукенцы колеру зімы.
І не будзе балець абаім,
што даўно невыносна балела.
А будзе толькі спакой.
І жыццё.
І мы...

...А пакуль мы складаем вечнасць
з дробных кавалачкаў лёду.
Ты побач са мною сядзіш
і мы зусім не спяшаем —
змярцвелыя некалі атамы
вадароду і кіслароду
цяплом сваіх рук
і дыханнем сваім ажыўляем...

Менск,
2020

Мой бацька ідзе ў пажарнікі


Бруна ШУЛЬЦ (1892–1942)

У першыя дні кастрычніка мы з маці вярталіся з лецішча, што знаходзілася ў суседнім дэпартаменце, у лясістым прырэччы Слатвінкі, наскрозь працятым крынічным пошумам тысячы струменяў. Усё яшчэ захоўваючы ў вушах расшыты птушыным цвырканнем шолах алешын, мы ехалі ў вялікай старой калымазе, што разбухла ў вялізны будан — рыхтык цёмны разложысты шынок, — зацiснутыя клункамі ў глыбокім, высланым аксамітам заглыбленні, куды праз акно карта за картай падалі каляровыя карціны пейзажу, нібы іх паволі тасавалі ў руках.

Пад вечар мы прыехалі на выдзьмутае вятрамі плато, на вялікае здзіўленае раздарожжа краю. Неба над гэтым раздарожжам стаяла глыбокае і задыханае, паварочваючыся ў зеніце каляровай ружай вятроў. Тут была самая далёкая застава краю, апошні паварот, за якім у доле адкрываўся разлеглы і позні восеньскі краявід. Тут была мяжа, тут стаяў стары спарахнелы памежны слуп з зацёртым надпісам і граў на ветры.

Вялікія абады калымагі зарыпелі і захраслі ў пяску, балбатлівыя бліскучыя спіцы замоўклі, і толькі вялікі будан глуха грукатаў і цёмна паляпваў на крыжовых вятрах раздарожжа, быццам аселы на пустках каўчэг.

Маці заплаціла мыта, шлагбаўм заставы падняўся, і тады калымага цяжка ўехала ў восень.

Мы выкаціліся ў звялую нуду вялізнай раўніны, у выцвілае і бледнае веянне, што адчыняла тут, над жоўтай далеччу, сваю ціхамірную і бясколерную бясконцасць. Нейкая позняя і бязмежная вечнасць паўставала з пабляклых даляў.

Як у старым рамане, перагорталіся зжаўцелыя старонкі краявіду, усё больш бледныя і бяссільныя, быццам мусячы скончыцца нейкай вялікай развеянай пустэчай. У гэтым развеяным небыцці, у гэтай жоўтай нірване мы маглі выехаць за межы часу і рэчаіснасці і ўжо назаўсёды застацца ў тым краявідзе, у тым цёплым няплодным веянні — нерухомы дыліжанс на вялікіх колах, захраслы сярод аблокаў на пергаміне неба, старая ілюстрацыя, забытая ў старасвецкім рассыпаным рамане гравюра, — але вазніца з апошніх сілаў тузануў лейцы, вывеў калымагу з салодкай спячкі гэтых вятроў і павярнуў у лес.

Мы ўехалі ў густую і сухую пышнасць, у тытунёвае завяданне. Неўзабаве вакол нас зрабілася ўтульна і карычнева, як у скрынцы «Trabucos». У гэтым кедравым паўзмроку нас праміналі камлі дрэў, сухія і пахкія, як цыгара. Мы ехалі, лес усё больш цямнеў, усё больш пахнуў водарным тытунём і ўрэшце замкнуў нас — быццам у сухім корпусе віяланчэлі, якую глуха настройваў вецер.

У вазніцы не было запалак, і ён не мог павесіць ліхтар. Сапучы ў цемры, коні знаходзілі дарогу інстынктыўна. Маці заснула. Час, нязлічаны, сплываў, творачы ў сваім сплыванні дзіўныя вузлы, абрэвіятуры. Цемра была непранікальная, над буданом яшчэ гудзеў сухі шум лесу, як раптам зямля пад капытамі коней збілася ў цвёрды вулічны брук, павозка павярнула на месцы і спынілася. Спынілася так блізка ад сцяны, што ледзь яе не зачапіла. Насупраць дзверцаў калымагі маці намацала ўваход у дом. Вазніца выгружаў клункі.

Мы ўвайшлі ў вялікую разлапістую вітальню. Там было цёмна, цёпла і ўтульна, як у старой пустой пякарні на досвітку, калі ў печы ўжо дагарэла, або як у лазні позняй ноччу, калі ў цемрадзі, у цішы, што адмяраецца гукам кропель, стынуць пакінутыя ночвы і цэбры. Цвыркун цярпліва выпорваў з цемры падманлівыя швы святла, ніклыя шыўкі, ад якіх не рабілася святлей. Мы навобмацак знайшлі сходы.

Калі на павароце дасягнулі рыплівай пляцоўкі, маці прамовіла:

— Прачынайся, Юзаф, ты падаеш з ног, яшчэ толькі некалькі прыступак.

Але я, сонны і непрытомны, прытуліўся да яе мацней і глыбока заснуў.

Ніколі потым я не мог дазнацца ў маці, колькі рэальнага было ў тым, што бачыў я ў тую ноч праз заплюшчаныя павекі, змораны цяжкім сном, зноў і зноў правальваючыся ў глухое забыццё, а колькі — плодам майго ўяўлення.

Была там нейкая вялікая спрэчка паміж маім бацькам, маці і Адэляй, пратаганісткай той сцэны, спрэчка, якая, як я цяпер здагадваюся, мела надзвычайнае значэнне. Калі маé спробы адгадаць яе няўлоўны сэнс усё яшчэ застаюцца марнымі, то вінаваціць у гэтым, несумненна, варта прабелы ў маёй памяці, сляпыя плямы сну, якія я намагаюся запоўніць выдумкай, здагадкай, гіпотэзай... Ноч дыхала чыстымі пульсамі і раптоўна скідвала празрыстую заслону зор, звысоку зазірала ў мой сон старым сваім і вечным тварам. Заблытаўшыся ў маіх вейках, промень далёкай зоркі разліваўся срэбрам па сляпым бялку вока, і скрозь шчыліны павек я бачыў пакой у святле свечкі, што завязла ў блытаніне залатых ліній і зігзагаў.

Зрэшты, гэтая сцэна магла адбыцца і ў іншы час. Многае паказвае на тое, што я быў яе сведкам нашмат пазней, калі ў нейкі дзень мы з маці і прыказчыкамі вярталіся пасля закрыцця крамы дадому.

На парозе нашага жытла маці выдала здзіўлены і захоплены крык, прыказчыкі аслеплі і анямелі. У сярэдзіне пакоя стаяў цудоўны масянжовы рыцар, сапраўдны святы Юр'я, узвялічаны кірасай, залатымі шчытамі нараменнікаў, усім звонкім рыштункам адпаліраваных залатых блях. Уражаны і радасны, я пазнаў бацькавы натапыраныя вусы і ўскудлачаную бараду, што тырчалі з-пад цяжкага прэтарыянскага шлема. Панцыр хадзіў ходырам на яго ўзбуджаных грудзях. Узбуйнелы ад зброі ў бляску залатых блях, ён быў падобны да архістратыга нябесных войскаў.

— На жаль, Адэля, — прамовіў бацька, — ты ніколі не разумела праблемы найвышэйшага парадку. Усюды і заўсёды ты перакрэслівала мае пачынанні выбухамі бяздумнай злосці. Але закуты ў зброю, сёння я смяюся з казытання, якім ты даводзіла безабароннага да роспачы. Бяссільная лютасць змушае цяпер твой язык да вартай жалю балбатні, бязглуздасць і грубасць якой мяшаюцца з дурасцю. Павер, яны напаўняюць мяне толькі сумам і спачуваннем. Пазбаўленая высакароднага палёту фантазіі, ты гарыш неўсвядомленай зайздрасцю да ўсяго, што ўзносіцца над звычайнасцю.

Адэля змерыла бацьку поўным бязмежнай пагарды поглядам і, звяртаючыся да маці, абураным голасам прамовіла:

— Ён забірае ўвесь наш сок! Выносіць з дому бутлі з малінавым сокам, які мы разам нагатавалі гэтым летам! Хоча аддаць яго на выпіванне тым нягоднікам-пампавальнікам. І ў дадатак абсыпае мяне грубасцямі. — Адэля коратка ўсхліпнула. — Капітан пажарнай каманды, капітан шалапутаў, — крычала яна, змяраючы бацьку поўным нянавісці позіркам. — Яны тут усюды. Калі я ранкам хачу спусціцца па хлеб, то не магу адчыніць дзверы. Ну вядома — двое з іх заснулі ў вітальні на парозе і заблакавалі выхад. На сходах, на кожнай прыступцы ляжыць адзін у касцы і спіць. Напрошваюцца ў кухню, суюць у дзвярныя шчыліны свае трусіныя твары ў масянжовых бляшанках, казыраюць двума пальцамі, як вучні ў школе, і ўмольна хныкаюць: цукру, цукру... Вырываюць у мяне з рук вядзерца і бягуць па ваду, танцуюць вакол, заляцаюцца, ледзь хвастамі не віляюць. А да ўсяго раз-пораз лыпаюць чырвонымі павекамі і агідна аблізваюцца. Толькі глянеш па-хуткаму на каторага з іх, а ў яго ўжо пухне твар бессаромным мясам, як у індыка. Даваць такім наш малінавы сок!..

— Твая прымітыўная натура, — прамовіў бацька, — брудзіць усё, да чаго дакранаецца. Ты накрэсліла вобраз гэтых сыноў агню, варты твайго дробязнага глузду. Што да мяне, то ўся мая сімпатыя належыць гэтаму нешчасліваму роду саламандраў, гэтым бедным абязволеным вогненным істотам. Уся віна гэтага цудоўнага колісь роду палягае ў тым, што яны падаліся да людзей на службу, прадаліся за лыжку ўбогай чалавечай ежы. За гэта ім аддзячылі пагардай. Дурасць плебсу не мае меж. Гэтых далікатных істот давялі да заняпаду, да канчатковай дэградацыі. Чаго ж дзіўнага, што ім не смакуюць харчы, гэтыя моташлівыя прасцецкія харчы, што гатуе жонка школьнага вартаўніка для іх і гарадскіх арыштантаў у агульным катле? Іх паднябенне, далікатнае і геніяльнае паднябенне вогненных духаў прагне высакародных і цёмных бальзамаў, водарных і каляровых флюідаў. Таму ў гэтую святочную ноч, калі мы сядзем у вялікай зале гарадской Стаўрапігіі за накрытыя белым сталы, у зале з высокімі, ярка асветленымі вокнамі, што кідаюць свой бляск углыб восеньскай ночы, а горад навокал раíцца тысячамі агнёў ілюмінацыі, кожны з нас будзе з піетэтам і гурманствам, уласцівымі сынам агню, мачаць булку ў кубак з малінавым сокам і паволі папіваць гэты высакародны і густы эліксір. Такім чынам падмацуецца ўнутраная сутнасць пажарніка, адродзіцца багацце колераў, якія гэты люд вывяргае з сябе ў выглядзе феерверкаў, ракет і бенгальскіх агнёў. Душа мая поўніцца жалем да іх убоства, да іх незаслужанага заняпаду. Калі я і прыняў з іх рук капітанскую шаблю, то толькі ў надзеі, што мне ўдасца выцягнуць гэтае племя з нэндзы, вызваліць ад прыніжэння і развярнуць над імі штандар новай ідэі.

— Ты так змяніўся, Якуб, — прамовіла маці, — ты цудоўны. Ты ж не сыйдзеш з дому на ноч? Не забывай, што з моманту майго вяртання ў нас не было магчымасці нармальна паразмаўляць.

А што да пампавальнікаў, — прамовіла яна, звяртаючыся да Адэлі, — то мне сапраўды здаецца, што ты кіруешся нейкай перадузятасцю. Яны мілыя хлопцы, хай сабе і нягоднікі. Я заўсёды з прыемнасцю гляджу на гэтых рослых маладзёнаў у зграбных мундзірах, хіба што трошкі перацягнутых у поясе. У іх столькі натуральнай элегантнасці, а іх старанласць ды імпэт, з якім яны штохвіліны гатовыя ўслужыць да́мам, так кранаюць... Колькі б у мяне на вуліцы ні выпадаў з рук парасон, колькі б ні развязваўся на чаравічку матузок, хтосьці з іх заўсёды тут як тут, поўны хвалявання і палкай гатоўнасці. Калі, выканаўшы свой рыцарскі абавязак, ён адыходзіць, яго тут жа акружае натоўп прыяцеляў, жыва абмяркоўваючы інцыдэнт, прычым герой жэстамі паказвае, як усё адбывалася.

Яны тут усюды. Калі я ранкам хачу спусціцца па хлеб, то не магу адчыніць дзверы. Ну вядома — двое з іх заснулі ў вітальні на парозе і заблакавалі выхад. На сходах, на кожнай прыступцы ляжыць адзін у касцы і спіць

— А вось я лічу іх дармаедамі, — прамовіў старшы прыказчык Тэадор. — Мы ж не пускаем іх тушыць пажары праз іх дзіцячую безадказнасць. Варта толькі паглядзець, з якой зайздрасцю яны звычайна спыняюцца перад групай хлопчыкаў, што забаўляюцца, кідаючы ў сцяну гузікі, каб ацаніць сталасць іх трусінага розуму. Як толькі з вуліцы даляятае дзікі галас гульні, можна не сумнявацца: вызірнуўшы ў акно, сярод хлапечага натоўпу напэўна заўважыш гэтых захопленых і стлумленых абібокаў, амаль непрытомных ад шумлівай беганіны. Убачыўшы пажар, яны шалеюць ад радасці, пляскаюць у далоні і танцуюць як дзікуны. Не, залучаць іх да тушэння пажараў не варта. Гэтым займаюцца камінары і гарадскія міліцыянеры. Пампавальнікам застаюцца толькі гулянні і народныя святкаванні — вось тады яны незаменныя. Напрыклад, восенню, пры т. зв. штурме Капітолія на цёмным досвітку, яны пераапранаюцца карфагенянамі і з пякельным галасам аблюжваюць Базыльянскі пагорак. Усе тады спяваюць «Hannibal, Hannibal ante portas» (Ганібал, Ганібал ля брамы! (лац.)).

А пад канец восені яны робяцца лянівымі і соннымі, засынаюць стоячы, а калі выпадае першы снег, іх ужо амаль не ўбачыш. Адзін стары пячнік расказваў, што, рамантуючы коміны, знаходзіць іх у канале дымахода — яны чапляюцца за сценкі і ў сваіх пурпуровых мундзірах і бліскучых касках дранцвеюць, як кукалкі. Так яны і спяць, стоячы, напіўшыся малінавага соку, поўныя ўнутры ліпкай слодычы і агню. Тады іх, п'яных ад сну і непрытомных, выцягваюць за вушы і адпраўляюць у казармы па ранішніх восеньскіх вуліцах, каляровых ад першых прымаразкаў, а вулічны зброд кідаецца ў іх камянямі...

— Як бы там ні было, — прамовіла Адэля, — соку я ім не дам. Не дзеля таго псавала я сабе на кухні скуру, гатуючы яго, каб гэтыя нягоднікі выпілі.

Замест адказу мой бацька падняў да вуснаў свісток і пранізліва свіснуў. Увайшлі чатыры рослыя маладзёны, якія быццам толькі што падслухоўвалі праз адтуліну для ключа, і пашыхтаваліся ля сцяны. У пакоі пасвятлела ад бляску іх касак, і яны, стаўшы па-вайсковаму, чакалі загаду. На знак бацькі двое з іх схапілі з абодвух бакоў вялікую аплеценую лазой бутлю з пурпуровай вадкасцю і перш, чым Адэля паспела ім перашкодзіць, з тупатам збеглі па сходах. Двое астатніх па-ваеннаму пакланіліся і сыйшлі следам за першымі.

Нейкае імгненне здавалася, што Адэля вось-вось дазволіць сабе нешта безадказнае — такія ў яе прыгожых вачах бліскалі маланкі. Але бацька не чакаў выбуху яе гневу. Ён адным скачком аказаўся на падаконні і раскінуў рукі. Мы пабеглі за ім. Рынак, густа засеяны агнямі, раіўся каляровымі натоўпамі. Пад нашым акном восем пажарнікаў расцягнулі колам вялікі кавалак парусіны. Бацька яшчэ раз павярнуўся, бліснуў усёй сваёй раскошай рыштунку, моўчкі нам адсалютаваў, а затым з раскінутымі рукамі, яркі, як метэор, скокнуў у ноч, што палымнела тысячай агнёў. Гэта было такое прыгожае відовішча, што мы ўсе захоплена запляскалі. Бацька тым часам спружыніста саскочыў з парусіны і, з трэскам страсянуўшы бляшаныя шкарлупіны, стаў на чале атраду, які, раздзяліўшыся на двойкі, расцягнуўся ў маршы доўгай калонай і паволі аддаляўся ўздоўж цёмных шпалераў натоўпу, паблісківаючы масянжовымі бляшанкамі касак.

**Пераклад з польскай мовы
Ганны Янкута**



Людміла АНДЗІЛЕЎКА

Два аповеды



Стары

Рыхтаваўца на базар ён пачынаў ужо з вечара серады. Апаражняў заплечнік, шматлікія яго кішэні ад лішняй, непатрэбнай у чацвер драбязы. Лічыў грошы, адпушчаныя на трату. Аглядаў, чысціў ровар. Мыў загадзя лепшыя штаны, вытрасаў-выбіваў у двары на дроце сваю адзіную на ўсе выпадкі жыцця і пагоды камуфляжную ватоўку.

Базар з'язджаўся ў Падсвілле раз на тыдзень, заўсёды ў чацвер, і прапусціць яго стары не мог. Гэты адзін дзень з тыдня ён рабіў сабе выходным, амаль што, бо пад вечар зноў вяртаўся ў буданчык «два на тры», дзе каторы год праходзіла яго жыццё з двухразовым на дні веласіпедным марш-кідком на чатыры кіламетры праз лес да сваёй хаты — пакарміць рабога ката Юзіка.

Кот быў малады, дужы і запраста мог абысціся без падкормкі: лоўшы быў кот — мышэй цягаў, складаў ля ганка «штабялямі», але прывык да ласкі і сумаваў, калі гаспадару не выпадала ўкрасціся са службы і дастацца, каб перамовіцца, пачасаць за вухам, напомніць, як завуць. Стары хоць на паўгадзіны, хоць на дваццаць хвілін, але заўсёды адмыкаў замок на дзвярах сенцаў, запускаў ката ў хату «паганяць дзіч, каб не завялася здань», прысядаў на ложак, падзываў ката — той і сам бы прыбег, ускочыў, ды не насмельваўся парушаць заведзены парадак, заглядаў у вочы, цярпліва чакаў, калі гаспадар пачне паляпваць па сваім сцягне шырокай загарэлай даланёй — сігаў на пеліну, будыкаўся, цёрся: стары гладзіў кацінную спіну, бліскучую, выгінастую — той удзячна працягла мурлыкаў.

Яшчэ адным чацвярговым рытуалам было купіць «Віскі», так гаспадар называў каціны корм любой маркі. Пад заканчэнне базару ён абыходзіў усе прыватныя крамкі пасёлка, пачынаў ад лёнзаводаўскіх пяціпавярховікаў, дзе стаяў павільёнчык пад назвай «Корзинка», там заўсёды быў «каціны халадзец». Стары запіхваў блiскучыя каляровыя пакецікі ў левы вонкавы кішэнь заплечніка і радаваўся, здаецца, больш за ката, бо той не надта гнаўся за фірмовымі прысмакамі, але заўсёды з'ядаў пакладзенае ў міску — да апошняга скрылька, у знак павагі і ўдзячнасці гаспадару.

Затым стары ішоў у «Партнёр», такую ж багатую і поўную разнастайным асартыментам прыватную крамку ў цэнтры пасёлка насупраць універмага. Тую ж, што стаяла на адным баку з універмагам, — «Віпра» — звычайна мінаў. Толькі калі батарэйкі ў ліхтары замяніць, ці мух многа завядзецца ў службовым будане, тады зазірне набыць ліпучку, а так — шмаццё яго не цікавіла. Апошняй, на самым выездзе з пасёлка, у драўляным будынку панскіх часоў, месцілася крама Калакольцаў, так звалі яе жыхары па прозвішчу гаспадара, сама ж крама назвы не мела. Яна цанілася тым, што стаяла ля бальніцы, і ў яе прыбягалі хворыя ў шэрых фланэлевых халатах; бальнічныя і былі тут заўсягдатаямі-пакупнікамі, то можна было сустрэцца з даўнім знаёмым, каго дарэмна лічыў пакойнікам, а во табе — жывы чалавек, кратаецца яшчэ пацюху. Такі ўжо век, восемдзесят тры — не жарт! Не сёння — заўтра рыхтуйся сам і будзь гатовы пачуць усякае.

Падсвілле гуло ў базарны дзень. З усіх вёсак з'язджаўся люд, хто закупіцца — хто што прадаць «з гаспадаркі». Пастаіць, паслухае ля таго, ля таго — тут і поўдзень настае, базар пасля першай гадзіны пачынаў складацца, зварочвацца. Вось тады і вяртаўся стары ў самую галоўную краму ў цэнтры на «біржы», тут, у былым пры савецтах рэстаране «Бярозка» адкрылі новую кропку «Вин-кон». Назва шыфравала высокае начальства він і кансервавага заводаў. Крама лічылася найвыгаднейшай. Яе не міналі ні мясцовая эліта, ні пралетарый, ні «пан», ні калгаснік, ні апошні жабрак. Тут налівалі з краніка, падвозячы з варот завода трактарам напрасткі акуратненькую пузатую цыстэрначку, запраўлялі праз шланг спецыяльна ўсталяваную ў магазіне ёмістасць — культурна абслугоўвалі насельніцтва; тут прадавалі віно ў маленечкіх, нібы ёгурт, пластыкавых «службовіках» па сто-дзвесце грамаў, пад фольгавай накрыўкай — вынось, пі за рогам ці ў скверыку, што насупраць. Толькі тут прадавалі не з-пад палы — як ва ўсіх іншых магазінах пасёлка, а адкрыта і без пароляў сваё мясцовае харошае віно. Стары браў сабе пару бутэлек моцнага.

Сын прывозіў з Мінска сухое — дарагое, «нярускае», у вузкіх, высокіх бутэльках з крута заглыбленым дном — раіў на тое асобна звяртаць увагу, маўляў, гэта і ёсць паказальнік сапраўднасці. «Сікі-сікамі — тваё дарагое віно!» — выплёўваў стары «сцулі» з рота і наліваў свайго, і ніколі не даваў веры ніякім «паказальнікам», акрамя ўласнага смаку; ні чужым пахвальбам, ні тэлевізійнай рэкламе: паспытаеш — пазнаеш.

Ён даўно мог лічыцца глыбокім пенсіянерам. Ды пашэнціла яму праз сына атрымаць месца вартаўніка сядзібы якогась сталічнага бізнесоўца. Чалавек з Мінска паставіў добры дом ля рэчкі ў лесе пры самай шашы. Нейкі час над ім лунаў на флагштоку белы сцяг з чырвоным пасам пасярод. Спачатку вартавых было трое, і заробак давалі сур'ёзны. Потым грошы ўрэзалі, а хутка і зусім пакінулі чвэрць ранейшага — ніхто не згаджаўся вартаваць за такі заробак. Стары застаўся адным, на каго хапіла ў мясцовага раённага начальства якойсьці сакрэтнай чвэрцьстаўкі пад аплату яго службы. Гаспадара, казалі, пасадзілі, а дом жа не кідаць «бясхозным» — прыйшлася сядзіба пад адпачынак тутэйшых. Заязджалі з дзяўчатамі ў лазню, спраўлялі застоллі. Так дзед застаўся служыць соднямі, бясспынна. Па шашы снавалі машыны — спыняліся пагаманіць. Стары выходзіў за вароты, слухаў навіны: хто памёр, хто «папаўся», хто «выкруціўся»… Ён выслухваў гаворкі, зрэдку ківаў галавой ці перапытваў, не дачуўшы: «Га?». Праз адзіноту і няўважлівасць да пустых плётак ён зрабіўся тугавухім: «Га? А-а-а…» — ці то згаджаўся, ці то адмахваўся ад нецікавага ён.

Удаўцом хадзіў даўно. Першыя гады яму сваталі кандыдатак, угаворвалі пазнаёміцца з жанчынамі, прывозілі здалёк: «Прыглядзіся, будзеш на старасці жыць з «інцілігенткай» — настаўніца!». Ён галіўся, стрыг валасы, ішоў у лазню, прыбіраў у хаце — інтэлігентная настаўніца ў першы вечар знаёмства напівалася, як бэля, і стары не мог дачакацца цягніка, каб выправіць кандыдатку ў належным напрамку. Другая настойліва цікавілася, ці добрая ў яго пенсія? «А ну яе! — злаваў жаніх. — Я ў роднай жонкі ніколі пад пятой не сядзеў — а буду нейкай бабе са свету патурацЬ?!» Сватоў адва́дзіў, але самі кандыдаткі ўпотай не раз прыходзілі на хутар, нават маладуха з-за парты прысунулася пад градусам аднойчы, каб паведаміць, што працуе путанай і бярэ не дорага — за паўцаны згодзіцца. Атрымала пад зад і шуравала цёмным лесам назад у пасёлак: «Хто сам набіваецца, той цаны не назначае!». Пытанне жаніцьбы даўно закрыць.

Інтэліге-енткі… Ды ў яго свая жонка была — Цар-баба! Ён тутэйшы, шафёрам працаваў пры эмтээсе. А яна, хоць нарадзілася ў суседніх мясцінах, — з Харбіну сюды прыехала. Страх — прыгожая! Валасы — хвалямі! Вочы выразныя, вясёлыя! А сама жывая, смелая… Якаясь таямніца вадзілася за ёй… Працавала ў Харбіне з паперамі сакрэтнымі і ніколі за жыццё не пахвалілася — што да чаго… А ён не лез пытацца — халера на іх з іхнімі сакрэтамі! Да жонкі ў сяброўкі набіваліся самыя важныя пані, але ўсё больш з выгадай, даводзілася ёй слугаваць ім: то бульбу дапамажы выкапаць — «я доктар, у мяне дзяжурства», то стравы нагатуй пад свята, то шпалеры паклей, прыбяры пасля рамонта. Быццам яна дзвюхжыльная, ці сваёй працы не хапае. Сяброўства! Вось жонка заўсёды ўмела трымацца інтэлігенткай.

Сын, едучы па сваіх сядзібах з Мінска на Браслаўскія азёры, мог заскочыць у вартавую будку, пахваліцца сталічным жыццём, як сабак кормяць «акарачкамі Буша», як чарговы раз купіў-прадаў яшчэ адну кватэру, як грошы лічаць не купюрамі — запячатанымі ляскамі банкаўскай пакоўкі: «Перабі, Міша!» — і слугач яго, пасліняўшы пальцы, доўга шалясцеў у шырокай скуранай сумцы. «Ай, сын, не ўчаствуй ты з імі! — махаў рукой у бок кагосьці няўвартага ўвагі і нават назову стары. — Ты лепш людзям памагай. Памагай, чым можаш.» І заўсёды пратэжыраваў яму чарговага прасіцеля, не надаючы ўвагі, што сам прасіцель быў з тых, на каго махала рука старога, і шукаў ён паратунку не ад жабрацтва-гаротнасці — хацеў выкруціцца з няўдалай афёры, якая пагражала на гэты раз кра́тамі.

Сын меў «вялікія сувязі», суадносна «рашаў вялікія пытанні»… Ён хлопчыкам з'ехаў у сталіцу, каб стаць суvoраўскім курсантам. Ці адыграла якуюсь ролю сакрэтная таямніца маці, ці не — невядома, бацьку і ў галаву не прыходзіла, што ў тую навучальную ўстанову не ўсіх прымаюць. Што не кожнага з сірот ваенных афіцэраў возьмуць бесперашкодна. Сын не прайшоў стоадсоткава адбор па фізічных патрабаваннях, але курсантам залічылі. Вучыцца — і добра, думаў бацька, паступіў на юрыста — маладзец, працаваць афармілі пры галоўным сталічным аддзеле МУС — таксама не блага: «Старайся жыць, сын».

Сын стараўся: ён пераняў ад бацькі бязмежную цярплівасць, безадмоўнасць перад вышэй стаячым па рангу, звычку жыць па статуту: выконваць, не перапытваць. Прыкладам ад малку застаўся ўспамін, як пасля цяжкай працы ў міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі бацька вечарамі мусіў начальству па розных патрэбах — вяселле, народзіны, юбілеі — цягаць браканьерскай сеткай рыбу. Як валіўся на дол выпрастаць скрученую радзікулітам спіну, як цёр збалелыя, сашморганыя да крыві вузлаватай рыбацкай сеткай рукі. Тады і ўелася ў сына гэта цяга: бездакорна дагадзіць начальству.

— Во мабільнік зноў зламаўся, — паведаміў стары сыну, які заскочыў «транзітам» на хвілінку.

— А дзе твой ранейшы? Гэта ж не той, што я прывозіў.

— Дык той нешта зламіўся. Піт забраў яго, мне гэты прывёз, трыста рублёў даў яму.

— Ты што, здурнеў?! За гэты чарапок ніхто шасцідзесяці не заплоціць. Трыста даў!

— А што я панімаю ў гэтых мабільніках? Ён сказаў — трыста, я і даў. Халера з імі, тымі грашмі. Але во і гэты ціліфон ня робіць — мне ён да лямпачкі, табе я званю заўсёды з дамашняга. Але Піт злаваць будзе. Ён па гэтых днях дзеўку возіць у лазню, а мне дазваніцца не зможа…

— Дык няхай за свае грошы купляе табе мабільнік, калі гэта яму нада. Чаму за тваё?

— А ну іх, тыя грошы.

— Ты б лепі мне даў…

Стары адшпіліў рамяні заплечніка, сунуў руку ў дальні ўнутраны аддзел, выняў стосік купюр.

— На. Нахалера яны мне. У мяне ўсё ёсць. Адзежы мне не нада. Есці ёсць што, у ката таксама. Нахалера мне грошы?

Сын паклаў цючок у нагрудную кішэню. Мірганyў свайму слугачу Мішу:

— Піт! Я ж табе казаў пра яго… Тут у бліжнім калгасе старшынёй быў, дабіў калгас да ручкі — абрабавалі купай звераферму, норак папі…дзілі. За гэта яго на вышэйшы ўзровень паднялі — удасканальвайся! Практыкуйся ў раённым маштабе! Першы наменсік цяпер — гаспадар у раёне!

Стары гаворкі быццам не дачуў. Яго даўно не цікавіла ніякае начальства. У яго жыцці нічога не мянялася ні з тымі прозвішчамі, ні з другімі. Абы работа была. Во без работы — гібель!

— А! Во, забыўся. Піт пытаўся, можа, каму ў Мінску норкі патрэбны на футра?

— Пашлі ты яго на х… з яго норкамі.

Сын вазіў старога да сябе. Пад Мінскам у яго вялікі пляц,

паставіў на ім чатыры будынкі. Але працавалі ў яго адны бадзякі пітушчыя, работнікі з іх — зжалься, Божа, трудоў! Стары прачнуўся рана — лапату ў рукі і траншэю капаць. Да паўдня, пакуль прачнулася брыгада, выкапаў роў — тыдзень капалі б.

— Гэты чай такі дарагі, ты нават уявіць не здольны! — хваліўся сын, частуючы бацьку.

— Дык я, напэўна, з табой, сын, ніколі, не разлічуся...

Сын міргаў свайму слугачу, маўляў, стары зусім з глузду з'ехаў, баіцца — буду грошы спаганяць...

Магутны мужык

— Не, бляха муха, — мяне гэта казыча! Ну як яму магла такая клёвая мянушка дастацца?! — Кірык глыбока зацягнуўся і неяк раздражнёна з гукам выдзьмуў цыгарэтны адхон Янусю проста ў твар.

— Ідзі ты! — адмахнуўся той ці то ад дыму, ці то ад пытання. — Табе што, няма чым заняцца, як гісторыю мянушкі высвятляць? — пад канец фразы эмацыйны ціск аслаб, бо Янусь засяродзіўся на нейкім аб'екце ў канцы двара. Яны стаялі на гаўбцы трэцяга паверха, — вызначыць, куды канкрэтна ўглядаюцца вочы Яна, не падавалася магчымым.

— Ну ты ж крыху даўней працуеш тут, няўжо не ведаеш, чаму яго так завуць?

— Яго так звалі яшчэ да майго прыходу сюды.

— Трэба ў Адама Папругі запытацца...

— Глядзі, каб ён табе распавёў...

— Чаму — не?

— Адась плёткамі не займаецца: так разане, што цябе «на раз» адвучыць...

...Нікому Восіч не перашкаджаў. Прыходзіў у офіс пунктуальна, абавязковым быў у справах. Далікатна трымаўся з усімі ўзростасвымі катэгорыямі. Адно крыху злавала і абяззбройвала зялёную ўніверсітэцкую моладзь, толькі-толькі прыторкнутую стажорамі на выпрабавальны тэрмін у прэстыжную кампанію, якую не раз наведваў «грозны Бацька», характэрная прытоенасць усмешкі і хітраваты позірк блёклых старэчых вачэй Восіча. Калі ў курылцы хтосьці спрабаваў аканфузіць «старарэжымнага дзеда» сучаснай камп'ютарнай фішкай, прынесенай са студэнцкай тусоўкі, высвятлялася, што дзед і сам не хіла прасунуты, тырчыць у тэме і валодае сучасным слэнгам не горш кодэра ці прогера.

Працоўны калектыў прадпрыемства, якое за апошнія гады вырасла ў геаметрычнай прапорцыі, патрабаваў быць у рэжыме. Калі чвэрць веку назад з сябрамі, былымі аднакурснікамі, арганізоўвалі яны адну з першых у краіне прыватную кампанію новага накірунку, усе здаваліся роўнымі, ва ўсякім разе, думалася так. Цяпер амаль нікога з былых не засталося, акрамя генеральнага, на чые грошы ўсё абапіралася, і вось самога Восіча. Менавіта гэтым і тлумачыла сабе прысутнасць «лядашчага пенсіянера» ў калектыве нецярплівая моладзь: маўляў, за тое, што плячо ў плячо з зубрамі стаяў ад вытокаў, тут і трымаюць яго з павагі. Вельмі хацелася хутчэй заняць аўтарытэтнае месца ў калектыве, ды змагацца са старым лічылася «не камельфо». Насамрэч, кожны з іх у свой час займеў шанец апячыся перад вопытам, спрытам, кемлівасцю і ведамі дзеда. Карацей, «цярпелі і трымалі» яго тут зусім не за выслугу гадоў. Былыя саратнікі Восіча — хто памёр, хто сыйшоў на пенсію ад імклівага руху электроннага прагрэсу, які даганяць не проста. «На здароўе!» — адказваў Восіч былым калегам, якія агітавалі таксама пакінуць працу, пайсці на заслужаны адпачынак: паказвалі кашы з грыбамі, нахвальвалі ўраджай на лецішчах. Лецішча і Восіч меў, садзіў грады, палівам сам — жонка гадоў пяць як памерла. Любіў і грыбы збіраць. Усё ў яго ішло без мітусні. Зоробак дазваляў дапамагаць сем'ям дарослых дзяцей і паездзіць у вандроўкі па свеце, чаго не мог раней дазволіць сабе на дзяржаўны заробак. І ездзіў у вандроўкі Восіч зусім не ў сумнай адзіноце...

Каханне яго жыцця прычакала Восіча на схodзе гадоў. Блакітнавокую, мініяцюрную Эмілію ён любіў ад студэнцкіх гадоў. Выйшла замуж Эма не за Восіча — за іх агульнага сябра, аднакурсніка, потым калегу, навуковага кіраўніка вось гэтай жа кампаніі: высокага, яскравага Яраша... Восіч ажаніўся на Тасі, роднай Эмілінай сястры. І пражылі вясёлай кампаніяй больш за сорак гадоў, нарадзілі дзяцей, дачакаліся ўнукаў і аўдавелі адзін за адным, спачатку Восіч, а хутка і Эмма.

Па выхадных і святах Восіч рэгулярна гасцюе ў сваячаніцы. Святкуюць разам свае дні народзінаў, дзяцей-унукаў, пляменнікаў, разы тры на год кавалер вывозіць даму сэрца ў замежную вандроўку.

Ёсць... таямніца яго мянушкі.

У калектыве ведаюць: Восічу хапае сто грамаў каньяку, каб асалавець. Тады ружовая лысіна і густа пабарвавелы твар пачынаюць ільсніцца, белы пушок на галаве робіцца яшчэ бялейшым, тырчыць у розныя бакі, бы намагнічаны, у такі момант яго пparticularly...

Неяк генеральны дырэктар кампаніі ў момант прыліву сентыментальнага ўспаміну юнацтва ўздумаў наведаць ветэрана-аднакурсніка. Ён зазірнуў у кабінет без асаблівай патрэбы, без справы — так, па-сяброўску, і тут яго вачам адкрылася выразная карціна: на працоўным месцы, проста за сталом спаў вядучы спецыяліст кампаніі. Офісны кампутар, «зараджаны парнаграфічнай кінастужкай», дэманстраваў актыўны сэкс, на экране манітора шчыравалі спатнелыя партнёры, ля ног Восіча ляжала маленькая парожняя пляшачка з-пад каньяку. Генеральны торкнуўся па інерцыі ўглыб кабінета, потым спыніўся, пахітаў галавой і выйшаў, шчыльна закрыўшы за сабой дзверы.

— М-могу-учий мужик! — пачулі на калідоры выпадковыя сведкі.

І падхапілі... Хутка мянушка прыжылася, а Восіч, здаецца, не даведаўся пра няўдалы візіт начальніка. Пачуўшы два гэтыя прыемныя словы, Восіч палічыў за права прыняць іх як ганаровы статус, належную і зусім не беспадстаўную ўзнагароду за доўгія працоўныя поспехі на прадпрыемстве.

Тугі вузел

Мініяцюры



Мікалай МАРОЗ

***

Хтосьці думае, што за грошы можна купіць усё. Але мінулае не купіш.

А трызніць такой паталагічнай думкай той, хто не хоча ашчасліўіць сённяшні дзень і наблізіць шчаслівы заўтрашні.

Ён жыве мінулым, а значыць, адсталым, збеглым.

Важна падтрымаць жывога, а не нябожчыка...

***

Каму мы цягалі ўсё жыццё каштаны з агню? Хто ўсё жыццё трымаў нас у паслушэнстве, рабіў з нас рабоў, нажываўся праз нас, даводзячы, што робіць нас шчаслівымі і вольнымі?

А рабілі нас тымі, каго зрабілі, не абставіны, а людзі. Такія ж, як і мы, з такімі ж мазгамі, нават з такой жа прыкладна адукацыяй. Але як умелі яны намі маніпуляваць! Гэта быў талент, якім валодалі не ўсе, і тыя, абраныя, ляпілі з нас, пластылінавых, што хацелі.

І сёння лепяць. Толькі ўжо іншыя, але з такім жа запалам, з такім жа смяротным адчаем, ад чаго валасы ўзнімаюцца дыбара. І яны па-свойму таленавітыя і такія ж абраныя. Абраныя не Богам, а чалавекам, які «трохі вышэй за Бога».

***

Апошні дзень жыцця — гэта па сутнасці ўжо божы дзень, і нікому не дазволена ўмешвацца, смакаваць апошнія хвіліны, калі чалавек размаўляе з Богам. Аднак умешваюцца. Як вось у праграме расійскага тэлеканала пад назваю «Апошні дзень». Паглядзеў толькі першую перадачу, на другой спатыкнуўся: разлічваў, што раскажуць пра артыста без «грыму», усё, як было, без потайкі, аднак жа ўтаілі тое, чаго я чакаў.

Перастаў глядзець. І таму, што дарэмная згуба часу, а яшчэ — не трэба прыпадабняцца да так званай некрафільскай дзяржавы, дзе ахвотна, з запалам гавораць пра нябожчыка, а павінны шанаваць творцу пры жыцці.

***

Паэт Алег Салтук, мой добра знаёмы, ужо нябожчык, не раз казаў жартам: «Мікола, павер, хто жэніцца — у таго жыццё сабачае, затое смерць чалавечая, а хто не — у таго сабачая смерць, затое жыццё чалавечае». Я ведаў, што гэта словы Касміча з рамана Караткевіча «Чорны замак Альшанскі». Мы разам смяяліся з гэтага жарта, пацяшаліся тым, што ў словах ёсць, відаць, ладная доля праўды. Нярэдка так бывае: чалавек пражыве пад абцасам у жонкі, і свету не бачыць, і грошай, а памрэ па-людску. У шыкоўнай дамавіне, з вянкамі, з кветкамі, можа, калі ўмеў жыць і дагаджаць, то і ўсешчаныя слова скажуць пра яго тыя, каму трэба гэта сказаць.

Пагавораць і пра таго, хто памёр нясляўна. Ад гарэлкі, ад безграшоўя ці таму, што зняверыўся чалавек у шчаслівай долі.

І пра аднаго, і пра другога будуць гаварыць. Пра першага нядоўга і са здзекам («Вось ён, падабцаснік?!» — скажуць), пра другога доўга і з павучаннем для іншых («Не пі, бо будзе, як з Мікіткам»).

Па-мойму, Космiч з «Чорнага замка...» — гэта ў нейкай ступені сам аўтар, сам Караткевіч, які позна жаніўся, доўгі час правёў, даруйце, такім жа бабылём і ўклаў у вусны галоўнага героя словы, блізкія самому. Праўда, не ведаю, ці думалася таму Космічу-Караткевічу, ужо жанацікy, што жыццё сабачае...

***

Каб выжыць, чалавеку патрэбны тры рэчы: хлеб, цыбуля і мыла. Вядома ж, і вада.

А яшчэ шчырае, сардэчнае слова таварыша, з якім будзеш дзяліць апошні гамёлак хлеба...

***

Чалавек усведамляе свой узрост са спазненнем. Здараецца нешта такое, як здрада жонкі ці мужа: уся вёска гудзе, а яму ці ёй на гэта напляваць.

Не напляваць на тое, што з гадамі. Іх не можаш не заўважаць, яны выпіраюць брыдкімі мяшэчкамі пад вачыма, адышкай, болямі ў суставах, сівізной ці лысінай праз усю галаву, стэнакардыяй, дэменцыяй, іншымі хваробамі.

Таму навучыся адпачываць, чалавеча!..

***

Ма́рылі людзі пра Марс, пра тое, што прыйдзе час, калі і там зажыве чалавек. Злёталі, але не абнадзеілі.

А так хочацца некуды знікнуць, на той жа Марс, каб не чуць пра злашчасны каронавірус, не бачыць, як паміраюць (і маладыя таксама) медыкі, звычайныя людзі — суседзі, сябры, проста добра знаёмыя, а самы «чалавечны чалавек», як здзекліва назваў фармальнага лідара краіны адзін з маскоўскіх філосафаў, ладзіць у царкве «бяседу», і ніхто не засцерагаецца ад заразы маскамі. Гэтае «шапказакідальніцтва» і трывожыць, непакоіць гэтае геройства чалавека, які не беражэ сваіх суайчыннікаў.

Такіх людзей называю дэфіністамі (ім усё да ядронай фені!). Яны дадаюць трывогі, а маглі б больш настойліва, ва ўсе званы званіць пра тое, што спараджае такія вірусы — пра глабальнае пацяпленне. Пра парніковыя эфекты і так званыя азонавыя дзіркі...

Чалавек на самога сябе навыдумляў столькі брыдоты, назапасіў столькі зброі, залез так глыбока ў нетры зямлі, што ўшчыльную падышоў да «чырвонай» рысы.

Сказала праўду шведская дзяўчынка Грэта Гунберг і сказала з горыччу: «Як вы адважыліся?! Вы сваімі пустымі абяцаннямі ўкралі мае мары». І падагуліла: навошта, маўляў, вучыцца дзеля будучага, калі яго можа і не быць?

Многія лідары краін свету адрэагавалі на словы актывісткі паблажліва, а то і са здзекам.

***

Асаблівае майстэрства сказаць так, каб нічога не сказаць. Каб заблытаць нас сваімі думкамі-выкрутасамі, пустымі абяцаннямі, сваім талентам слоўнага эквілібрыста.

Такіх трэба ў цырк, а не ў палітыку.

***

«Женщина всегда права» — такая важкая ідыёма ўганаравала святочную імпрэзу, якую ладзілі ў Шумілінскай дзіцячай школе мастацтваў з нагоды Жаночага дня. Выраз збянтэжыў не таму, што гэта не можа быць няпраўдай. Азадачыў ён тым, што паважаныя настаўнікі ад мастацтва паказалі сваю выключную эмансіпіраванасць, жаданне хоць у такі дзень пабыць у матрыярхаце. Калі, як прызналася адна з гераіняў фільма «Дзяўчаты», «во дзе яны ў нас сядзелі», і сціснула кулачок. Маецца на ўвазе, мужчыны.

Свята, аднак, не застольнае, не гульбічнае, дзе можна і пацяшацца, і пажартаваць. Тут выраз не да месца. Не ратуе яго нават французская прыказка: «Калі жанчына не мае рацыю, папрасі ў яе прабачэння». Прасяць, і нярэдка. Лепш усё ж можна было арыентавацца на больш дасканалую лірыку, скажам, на Яўгенія Еўтушэнку (не раўня ж Ірыне Панароўскай!), які мовіў: «Бог — гэта жанчына, а не мужчына...». Няхай у словах шмат экспрэсіі, асабістага, няхай гэта мастацкі вобраз, таму і дыскусійны, тым не менш няма ў іх той катэгарычнасці, на якую спаўзлі ў школе мастацтваў.

***

Нехта выгукнуў: «Мне выразалі страх. Смерць мяне не хвалюе».

Не ведаю, чаго ў словах больш: бравады ці ўсведамлення сябе жывым трупам.

Без страху няма жыцця. Не паталагічнага, не таго, што з клінікай, а звычайнага, нармальнага. Страх за дзетак, за ўнукаў, страх за сваяка, які ў бальніцы і з цяжкім дыягназам, за краіну, за яе вольны і незайздросны лёс...

Страх — як праяўленне трывогі. Што, гэта хіба не чалавечае пачуццё? Навошта яго выразаць? Каб зрабіць з чалавека манкурта?..

Францішак Багушэвіч

Апошні аповед з будучай кнігі «Айчына: маляўнічая гісторыя»

Уладзімір АРЛОЎ

Францішак Багушэвіч — наш першы выдатны нацыянальны паэт. Ён на поўны голас абвясціў пра існаванне беларускага народа і багацце яго мовы, якую назваў «адзежаю душы». Погляды песняра леглі ў аснову беларускага нацыянальнага Адраджэння.

Маладыя гады

Францішак прыйшоў на свет 21 сакавіка 1840 года ў фальварку Свіраны пад Вільняй. Блізкім часам бацькі — Канстанцыя і Казімір Багушэвічы — перабраліся жыць у спадчынны маёнтак Кушляны Ашмянскага павета. Там, між прыгожых беларускіх лясоў, лугоў і палёў, прайшло Францішкава дзяцінства. Там у ягоным сэрцы назаўсёды пасялілася любасць да беларускай зямлі і роднай мовы.

Бацькі-шляхцічы выправілі яго вучыцца ў Віленскую гімназію. У ёй сябрамі будучага паэта сталі разумныя і смелыя хлопцы Цітус і Кастусь Далеўскія, Зыгмунт Мінейка, Юльян Чарноўскі. Праз дзесяць гадоў, у векапомным 1863-м, гэтыя юнакі сталі паўстанцкімі важакамі і праславілі сябе адвагаю і геройнымі ўчынкамі. Францішкавым аднадумцам быў і ягоны малодшы брат Валяр'ян, які таксама вучыўся ў Вільні.

З гімназіі Багушэвіч выйшаў у дарослае жыццё ў ліку чатырох найлепшых вучняў. Веды дазволілі яму паступіць на фізічна-матэматычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Але вучыцца там Багушэвічу не давялося.

Акурат тады ўвялі новыя правілы для студэнтаў. Іх пазбавілі шматлікіх ранейшых правоў: забаранілі праводзіць у сценах універсітэтаў сходы і канцэрты, закрылі касы ўзаемадапамогі, увялі плату за наведванне лекцый. Гэта адразу адчулі на сабе юнакі з небагатых сем'яў.

Францішак з таварышамі пастанавілі змагацца за справядлівасць і адмовіліся атрымліваць заліковыя кніжкі. Некалькі сотняў студэнтаў выйшлі на дэманстрацыю па пецярбургскім Неўскім праспекце. Паліцыя арыштавала дзясяткі ўдзельнікаў пратэсту. Іх адправілі за краты ў Петрапаўлаўскую фартэцу. Шмат каго выключылі з універсітэта, а сама навучальная ўстанова была часова зачыненая. У тых умовах Багушэвіч напісаў рэктару заяву, дзе прасіў звольніць яго «з прычыны неспрыяльнага клімату, каб з парады доктара вярнуцца ў мясціны сваёй Радзімы».

Вярнуўшыся з Пецярбурга ў Беларусь, Багушэвіч пайшоў настаўнічаць у вясковую школку ў Доцішках на Лідчыне. Там у 1863-м яго і заспеў пачатак збройнага змагання.

Баявыя пабрацімы

Будучы паэт разам з братам Валяр'янам без ваганняў стаў у шэрагі паўстанцаў. Змагарам дапамагала ўся сям'я Багушэвічаў. Сястра Ганна за ўдзел у барацьбе пазней патрапіла ў турму, арыштоўвалі і бацькоў. Валяр'ян Багушэвіч з'ехаў з радзімы ў эміграцыю.

Францішак ваяваў пад камандаваннем легендарнага Людвіка Нарбута. Аддзел вёў бai з карнымі войскамі ў наваколлі Ліды. Паўстанцаў падтрымлівалі беларускія сяляне. У той самы аддзел быў залічаны і італьянец па нацыянальнасці, але перакананы ліцьвінскі патрыёт мастак Міхал Андрыёлі.

Дзеля будучага шчасця Айчыны жыццём рызыкавалі ўсе лепшыя людзі краю. Яны паказалі свету, што Беларусь не стала перад Расеяй на калені і хоча быць свабоднай краінай. Пра гэта нашы ваяры спявалі ў сваіх песнях, якія меў кожны аддзел. Баявы марш для пабрацімаў-нарбутоўцаў напісаў Францішак Багушэвіч. У той час у яго ўжо абудзіўся паэтычны талент.

Супроць аднаго беларуса-ліцьвіна ваявала дзесяць, дваццаць, а часам і сто ворагаў. У няроўным баі загінуў Людвік Нарбут. У Вільні карнікі схапілі і расстралялі Цітуса Далеўскага — гімназічнага сябра Францішка.

Не спыняючы баёў, нарбутоўцы пасля смерці камандзіра перайшлі за Нёман у Аўгустоўскія лясы. Там у гарачай сутычцы з ворагамі нядаўні малады настаўнік Багушэвіч быў паранены і пакінуў змагарскія шэрагі.

Расстанне з Бацькаўшчынай

Ратуючыся ад астрожнай камеры і кайданоў, Францішак патаемна пераехаў ва Украіну.

Былы змаганец быў таленавітым канспіратарам. У горадзе Нежын Чарнігаўскай губерні ён скончыў юрыдычны ліцэй і доўга быў судовым следчым ва Украіне і ў Расеі. Ён раскрыў шмат злачынстваў і дапамог многім людзям. За паспяховую следчую працу Францішка ўзнагародзілі ордэнамі святога Станіслава і святой Ганны. Але для Багушэвіча нязмерна даражэйшая за ордэны была галінка каліны з белымі кветкамі, якую калісьці ўручыў яму за мужнасць Людвік Нарбут…

Следчага Багушэвіча паважалі калегі, ён меў надзейных сяброў і прыяцеляў. Аднак сэрца клікала туды, дзе жыў яго народ, дзе гучала мілагучная беларуская мова, якую ён любіў і ніколі не забываў, хоць царскія чыноўнікі лічылі яе не мовай, а «беднай мужыцкай гаворкай».

Зноў прайсці па дарагіх з юнацтва віленскіх вуліцах і пляцах Багушэвіч змог толькі праз дваццаць гадоў. Ён прыехаў на радзіму з жонкай Габрыэляй (родам з Менска) і малымі дзецьмі: Канстанцыяй і Тамашом.

Францішак уладкаваўся ў Вільні на пасаду адваката ў акруговым судзе. Ён найперш браўся за справы сялянаў і гарадскіх беднякоў. Простыя людзі паважалі яго за тое, што з беларусамі ён гаварыў па-беларуску. Пад вокнамі кватэры Багушэвічаў на віленскай вуліцы Конскай (па-літоўску яна называецца Арклю) часта спыняліся вясковыя вазы і ў чаканні заступніка тупалі купкі сялянаў у саматканым адзенні.

Жыхары Вільні ды навакольных вёсак і мястэчак з любоўю называлі Багушэвіча «мужыцкім адвакатам». Пакуль што амаль ніхто не ведаў: Францішак не толькі бароніць беларусаў у судах. Ён складаў для беларусаў на іх роднай мове вершы.

«Дудка беларуская»

Багушэвіч вастрыў сваё пяро нататкамі пра віленскія падзеі, якія друкаваў у пецярбургскім польскамоўным часопісе «Край». Біёграфы песняра адзначалі, што ў нешматлікіх радках яму ўдавалася цікава, трапна, часам афарыстычна перадаць пульс разнастайнага жыцця вялікага горада. У «Краі» Багушэвіч змясціў паўсотні артыкулаў і нататак, ды ўжо быў упэўнены: яго пакліканне — паэзія.

У 1891 годзе ўбачыла свет першая паэтычная кніга Францішка Багушэвіча — «Дудка беларуская». У царскай Расеі друкаваць кнігі на нашай мове забаранялася. Таму «Дудка беларуская» была выдадзеная ў Кракаве, што знаходзіўся ў складзе Аўстра-Вугоршчыны. На вокладцы замест прозвішча аўтара стаяў псеўданім — Мацей Бурачок. Гэтая і наступныя кнігі Багушэвіча друкаваліся па-беларуску лацінкаю, гэтаксама, як выдаваў «Мужыцкую праўду» Каліноўскі.

«Дудка беларуская» пачыналася з прадмовы, у якой Багушэвіч разважаў пра нашую мову, якую каланізатары не пускалі ў школы і друкарні, у цэрквы і касцёлы. Мацей Бурачок пісаў, што толькі цёмныя людзі завуць мову прадкаў «мужыцкай». Народ, які забыў родную мову, ён параўноўваў з тым чалавекам, каму жыць засталося нядоўга.

Учытаемся ў гэтую прадмову, каб адчуць яе глыбіню і мудрасць:

«<…>Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людзям, і гаворым жа мы ёю шмат добрага, але так ужо мы самі пусцілі яе на здзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахвотней гавораць па-французску, як па-свойму. Яно добра, а нават і трэба ведаць суседскую мову, але найперш трэба ведаць сваю. Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»

У гэтай знакамітай прадмове Багушэвіч выявіў сябе і знаўцам гісторыі:

«Літва пяцьсот дваццаць гадоў таму ўжо была ад Балтыйскага мора ўдоўжкі аж да Чорнага, ад Дняпра і Днястра-ракі да Нёмна; ад Каменца места аж да Вязьмы — у сярэдзіне Вялікаросіі; ад Дынабурга і за Крамяньчук, а ў сярэдзіне Літвы, як тое зерне ў гарэху, была наша зямліца — Беларусь!».

У той час царскі ўказ забараняў ужываць назву «Беларусь» у кнігах і дакументах. Паэт смела сцвярджаў, што, нягледзячы на прыгнёт, Беларусь — жыве! Пры канцы прадмовы аўтар «Дудкі» даваў адказ на пытанне, дзе ж тая Беларусь цяпер:

«Там, братцы, яна, дзе наша мова жыве: яна ад Вільні да Мазыра, ад Віцебска за малым не да Чарнігава, дзе Горадня, Менск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак».

Прадмову да «Дудкі беларускай» часам называюць беларускім нацыянальным маніфестам.

Дзякуй, браце Бурачок!

Першым у «Дудцы беларускай» быў надрукаваны верш, які так і называўся — «Мая дудка»:

Эх, скручу я дудку!
Такое зайграю,
Што ўсім будзе чутка
Ад краю да краю!..

Спеў паэтычнай дудкі Францішка Багушэвіча сапраўды быў пачуты. Інакшай і не магло здарыцца, бо ён з вялікім талентам пісаў пра лёс багатага душой, але паняволенага народа, выкрываў прыгнятальнікаў, верыў у лепшую долю беларусаў. «Дудку беларускую» чыталі і перадавалі з рук у рукі не толькі сяляне ў вёсках. Яе высока цанілі ў адукаваных колах грамадства. У водгуках пісалі, што паэт «падабраў жывая парасткі беларускага жыцця».

Адзін з прыхільнікаў Францішка, гаспадар сельскагаспадарчай крамы ў Вільні, дарыў «Дудку беларускую» кожнаму пакупніку-селяніну. Цікава, што таемным перавозам кніг з Кракава ў Беларусь займаўся малады шляхціч-рэвалюцыянер беларус з паходжання Язэп Пілсудскі. Пазней ён стаў кіраўніком адроджанай Польскай дзяржавы.

Вершы, байкі, апавяданні

Праз год пасля «Дудкі беларускай» зноў за мяжой выйшаў асобнаю кніжкай аповед Багушэвіча «Тралялёначка», а следам за ім — новы зборнік вершаў «Смык беларускі». Неўзабаве Францішак атрымаў ад сваяка спадчыну. Грошы дазволілі Багушэвічу разлічыцца з пазыкамі і адбудаваць бацькоўскую сядзібу ў Кушлянах. Ён звольніўся са службы і цалкам аддаўся літаратурнай творчасці.

Пры жыцці яго кнігі былі забароненыя расейскімі чыноўнікамі. Дагэтуль невядома, дзе схавалі яны рукапіс трэцяй кніжкі вершаў «Скрыпка беларуская». Знік з Віленскай друкарні і зборнік «Беларускія апавяданні Бурачка». Але насуперак усім перашкодам справа паэта засталася жыць.

Францішак Багушэвіч узбагаціў нацыянальнае прыгожае пісьменства творамі розных літаратурных жанраў. Вялікую папулярнасць мелі паэма «Кепска будзе!», вершаваныя аповеды «У астрозе» і «Свая зямля», байка «Воўк і авечка», апрацоўкі народных казак, кароткія дасціпныя апавяданні «Сведка» і «Палясоўшчык». Вершы з вялікай нізкі «Песні» сапраўды рабіліся песнямі.

Жывучы ў родных Кушлянах, пясняр складаў слоўнік нашай мовы, які, на жаль, не збярогся. Ён марыў выдаць і беларускую граматыку, бо літаратурная мова ў той час была яшчэ недастаткова развітая. Але першым чынам сцвярджаў велізарнае багацце і магчымасці беларускага слова ў творчасці. Багушэвіч верыў, што працуе дзеля будучыні народа:

Ой, дайце ж мне смык,
Каб усюды граў!
Хоць бы сам я знік,
Абы голас даў…

На пачатку ХХ стагоддзя справу Францішка Багушэвіча прадоўжылі Янка Купала, Якуб Колас, Цётка (Алаіза Пашкевіч), Максім Багдановіч…

Вольнае слова не забароніш!

Жыццёвы шлях Багушэвіча завяршыўся ў 1900 годзе ў Кушлянах. Паэт так і не дачакаўся, калі яго кнігі будуць вольна друкавацца ў Беларусі. У час рэвалюцыі 1905–1907 гадоў яны выдаваліся асобнымі кніжкамі і ўлёткамі-пракламацыямі, аднак адразу ж зноў патрапілі пад забарону.

Сваім ідэйным папярэднікам і настаўнікам лічылі Францішка Багушэвіча стваральнікі Беларускай Народнай Рэспублікі, пра якую пойдзе гаворка ў трэцяй частцы «Айчыны».

У савецкай Беларусі вальналюбныя глыбока нацыянальныя творы Багушэвіча таксама, як і ў царскай імперыі, хутка трапілі пад шматгадовую забарону. Бальшавікі загадвалі спальваць усе знойдзеныя ў бібліятэках кнігі класіка. Гэтую пастанову скасавалі ў часе вайны СССР з гітлераўскай Нямеччынай. Савецкія ўлады вырашылі, што патрыятычныя вершы Багушэвіча будуць натхняць беларусаў на барацьбу з нямецкімі захопнікамі.

Цяпер кнігі Францішка Багушэвіча ёсць у кожнай бібліятэцы Беларусі.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: **(8-017) 354-80-91.** Адрас электроннай пошты: **sbp@tut.by**